№№177–178
(2905–2906)

21 лістапада 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

ТЕМА ДНЯ

Российский Центробанк принял решение о девальвации рубля. Чем ответит белорусский Нацбанк?

Как сообщают российские СМИ, Центробанк и правительство России приняли решение о девальвации рубля. Сообщается, что до нового года рубль будет падать плавно, и к 1 января доллар будет стоить около 30 рублей, а к весне курс национальной валюты достигнет отметки в 35 рублей за доллар.

На такой прогноз, по данным "Русского Newsweek", надеются в российских Центробанке и правительстве. Решение о девальвации рубля уже принято, утверждает издание. Благодаря такой политике должна увеличиться прибыль у компаний-экспортеров, кроме того, вырастет спрос на отечественные товары. События, которые предшествовали окончательному решению о девальвации рубля, развивались стремительно, пишет журнал. Когда Дмитрий Медведев в своем послании предлагал удлинить президентский срок, текст поправки еще даже не был написан. Но взятый Кремлем темп удивил даже чиновников. Сначала Думе сказали принять сразу за один день. Но вдруг темпы снизились — поправку примут неделей позже. Что за спешка была, спрашивали потом в Думе. Это в Кремле и в Белом доме началась паника, уверяет издание. Неделей раньше, когда Медведев обращался к Федеральному собранию, риск обвала национальной валюты был еще не так очевиден.

Однако уже в понедельник глава Центробанка Сергей Игнатьев не исключил девальвации рубля. Во вторник рубль упал на 1%. Банкиры и чиновники практически единодушно пришли к выводу: к концу года доллар будет стоить как минимум 30 рублей. А в среду глава Минфина Алексей Кудрин снизил бюджетный прогноз цен на нефть до 50 долларов за баррель.

Таким образом, финансовые власти страны окончательно простились с профицитным бюджетом и твердым рублем. Другого выбора не было: по оценкам экспертов, на прошлой неделе на поддержание курса Центробанк потратил никак не меньше 10 млрд долларов. Денег на все не хватает, и вливать такие средства в рубль Центробанк может только три месяца. И не исключено, что потом ему все равно пришлось бы резко уронить рубль. Профицитный бюджет и твердая национальная валюта были фундаментом общественного оптимизма последних лет. Как только стало ясно, что ни того, ни другого не будет, экономический кризис в России тут же перерос в политический, и Владимир Путин принялся искать выход.

Многие помнят, что девальвация российскаго рубля в 1998 году обернулась гораздо большими потерями для рубля белорусского. Что произойдет на этот раз?

По Минску активно гуляют слухи о том, что Нацбанк намеревается осуществить разовую значительную девальвацию белорусского рубля. В столичных банках уже говорят, что возможности дальнейшего удержания курса исчерпываются и даже миллиардный кредит из России уже не спасет. Однако официальные лица эту информацию категорически опровергают. "Никакого обвала не будет, — категорично заявляет пресс-служба Национального банка. — Это ничем не подтвержденные слухи. Ситуация не выходит за рамки прогнозируемых показателей. Девальвация рубля в незначительных размерах происходит каждый день, но о серьезном размере речь не идет".

Неофициально государственные экономисты говорят, что дальнейшая финансовая политика в Беларуси будет зависеть от итогов переговоров между Беларусью и Международным валютным фондом о предоставлении нашей стране кредита в 2 миллиарда долларов. Пока итоги этих переговоров не известны. МВФ не говорит ни "да", ни "нет, но заместитель главы белорусского правительства Андрей Кобяков уже признался, что переговоры с МВФ проходят непросто.

В общем, похоже, вновь сбудется пессимистичный народный прогноз: сначала мы были бедными, а потом нас обокрали...

Елена НОВИКОВА.

Апісалі маёмасць...

У офісе руху "За Свабоду", што ствараецца ў Беларусі, у аўторак апісвалі маёмасць. Пра гэта паведаміў каардынатар руху Віктар Карнеенка.

Паводле слоў В.Карнеенкі, вечарам 18 лістапада ў арандаваную ў якасці офіса кватэру прыйшлі судовыя выканаўцы. Яны пачалі апісваць маёмасць. *"Канфіскоўваюць усё: камп'ютэры, усю аргтэхніку, мэблю. У адказ на пратэсты апазіцыянераў прыставы выклікалі міліцыю. Фактычна ў офісе адбываецца вобыск"*, — сказаў В.Карнеенка.

Кватэру на праспекце Незалежнасці ў Мінску, дзе нефармальна збіраюцца актывісты руху, арандуе намеснік кіраўніка ствараемага руху "За Свабоду" Аляксей Кавалец. Судовыя выканаўцы заявілі, што тут жыў чалавек, маёмасць якога павінна быць апісана. *"Размова ідзе пра сына гаспадыні кватэры. Але гэты чалавек ужо 10 гадоў не мае да гэтай кватэры ніякага дачынення. З гаспадыняй судовыя выканаўцы адмовіліся размаўляць. Нягледзячы на тое, што ім быў паказаны дагавор аб арэндзе памяшкання, прыставы ўсё роўна заявілі, што маёмасць павінна быць апісана"*, — сказаў актывіст руху Аляксандр Жучко, які знаходзіцца ў памяшканні.

Сяргей ПУЛЬША.

АНОНС

Сёння толькі ў Мінску не хапае 2,5 тысячы ўрачоў! А ўсяго па краіне «вакантнымі» застаюцца больш за 5 тысяч урачэбных ставак. Прычым амаль кожны пяты працуючы ўрач — пенсіённага ўзросту.

(Працяг тэмы — на 2-й стар)

Дзе ў Беларусі пражыць лягчэй?

Самыя нізкія цэны на прадукты харчавання ў кастрычніку былі ў Ваўкавыску, Светлагорску, Шчучыне і Жыткавічах.

"Разбежка" ў цэнах на прадукты харчавання па розных гарадах Беларусі даволі істотная. Так, напрыклад, сярэдняя цана на ялавічыну першай катэгорыі на канец кастрычніка бягучага года складала 10.340 рублёў за 1 кг. Пры гэтым цана вагалася ад 8460—9500 у Оршы, Гомелі, Светлагорску, Барысаве да 10.730—11.330 у Брэсце, Віцебску, Магілёве.

Як паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт, самыя нізкія цэны на свініну (8400—8990) былі ў Светлагорску, Ваўкавыску, Шчучыне, Клімавічах, самыя высокія — у Пінску, Жыткавічах, Беразіне, Бабруйску (12.290—13.000).

Свежая капуста ў кастрычніку прадавалася ў сярэднім па 671 рублю. Самыя нізкія цэны на капусту былі ў Жыткавічах, Шчучыне, Стоўбцах, Горках — 410—510 рублёў, а ў Віцебску, Оршы, Магілёве, Чавусах тая ж капуста каштавала значна даражэй — 700—860 рублёў за 1 кг.

Параўнальны аналіз цэн штомесяц праводзіцца на прадпрыемствах гандлю ўсіх форм уласнасці, афіцыйных і неафіцыйных рынках у 31 горадзе Беларусі. Самыя высокія цэны, згодна з гэтым даследаваннем, былі ў Мінску, Віцебску, Магілёве, Оршы, Клімавічах і Салігорску.

Экскурсійныя аўтобусы будуць ездзіць па Мінску

Рэгулярны аўтобусны экскурсійны маршрут па Мінску плануе арганізаваць неўзабаве ўпраўленне фізічнай культуры, спорту і турызму Мінгарвыканкама. Падобныя экскурсіі ўжо арганізоўваюць некаторыя сталічныя турагенцтвы. Аднак такога маршруту, які б стаў для турыстаў візітнай карткай Мінска, на думку чыноўнікаў, няма. І вось з'явіцца.

Сетка даўжынёй у паўкіламетра

Падчас затрымання браканьераў на вадасховішчы "Сялец" у іх была канфіскавана рыбацкая сетка агульнай даўжынёй ажно ў паўкіламетра. Гэта свайго роду крымінальны рэкорд. Ёю аматары незаконнай рыбалкі нанеслі ўрон арандатару амаль на два мільёны рублёў.

Где деньги дают?

Сообщите, какие банки остановили выдачу кредитов на покупку недвижимости и автомобилей, а какие все-таки деньги выдают?

Борис Варава, г.Минск.

Получить кредит на приобретение автомобиля в "БПС-Банке" и "МТБанке" не удастся как минимум до следующего года, а в "БТА-Банке" и "Белгазпромбанке" сообщили, что выдача данных кредитов приостановлена на неопределенный срок.

Некоторые банки не приостановили выдачу данных кредитов, но ввели дополнительные ограничения. Например, "Белвнешэкономбанк" выдает кредиты только на покупку новых автомобилей, а в "Паритетбанке" автокредит, по словам консультанта, можно взять "теоретически".

На данный момент получить кредит на покупку автомобиля можно было в следующих банках: "Белагропромбанк", "АСБ Беларусбанк", "Белинвестбанк", "Приорбанк", ВТБ (Беларусь), "Альфа-Банк" (бывший "Межторгбанк"), "Белросбанк".

Кредиты на покупку (строительство) недвижимости временно перестали выдавать "БПС-Банк", "Белвнешэкономбанк" и "Белгазпромбанк". Серьезно изменились условия предоставления данного кредита в "Паритетбанке" (только под поручительство, совокупный доход семьи не рассматривается) и ВТБ (Беларусь) — доля собственных средств при покупке жилья увеличилась с 10—20% до 30—50%.

На данный момент получить кредит на покупку (строительство) недвижимости можно в следующих банках: "Белагропромбанк", "АСБ Беларусбанк", "Белинвестбанк", "Приорбанк", "Паритетбанк", ВТБ (Беларусь), "Белросбанк".

Помимо приостановки кредитных программ, "кризис" сказался и на величине процентных ставок по вновь получаемым кредитам. Если всего несколько месяцев назад получить кредит на покупку автомобиля можно было в среднем под 11—13% годовых (в валюте) или 16—18% (в Br), то сейчас средняя процентная ставка по кредитам в валюте и в белорусских рублях равна 18—20% годовых, причем некоторые банки выдают кредиты под 23—24% годовых.

В МИРЕ

Хиллари Клинтон знает Беларусь не только по карте

Британская газета "The Guardian" узнала о том, что Хиллари Клинтон намерена принять предложение Барака Обамы возглавить Госдепартамент в новой администрации США. Данное событие в некотором роде эпохальное для Беларуси.

Хиллари Клинтон будет первым государственным секретарем, который знает о Беларуси не понаслышке. И если в очередной раз Лукашенко придет в голову сказать о сотрудниках Госдепартамента, что "они даже не знают, где на карте находится наша страна", то на этот раз он попадет пальцем в небо. В 1994 году Хиллари побывала в Минске в качестве супруги американского президента Билла Клинтона.

— Тогда мы целый день провели с Хиллари в Минске, — вспоминает Ирина, супруга Станислава Шушкевича, который в 1994 году возглавлял Верховный Совет Беларуси. — У нас была своя отдельная программа. Билл Клинтон в то утро выступал в Академии наук, а затем посетил Куропаты. А мы с Хиллари были в детской поликлинике на Партизанском проспекте, куда она привезла гуманитарную помощь. Мы общались с ней весь день, ездили в машине по Минску. Помню, меня очень удивила, насколько Хиллари умная и эрудированная женщина, прекрасно разбирающаяся во всех вопросах, начиная от политики, заканчивая балетным искусством и сельским хозяйством. Мы даже поговорили с ней о борьбе с колорадскими жуками. Для меня эта тема была понятной — я ведь дачница... А у Хиллари, казалось, нет таких тем, на которые она не могла бы поддержать разговор.

Ирина считает, что белорусско-американские отношения только выиграют с приходом в Госдеп Хиллари Клинтон. По крайней мере, большинство экспертов в области международных отношений считают, что Беларусь не выпадет из поля зрения нового государственного секретаря. Тем более что еще 13 февраля Кондолиза Райс сообщила, что администрация Белого дома включила в бюджетный запрос на 2009 год 60 млн долларов для финансирования специального Фонда поддержки демократии и прав человека в таких странах, как Беларусь, Россия, Китай, Ливан, КНДР, Тайланд, Венесуэла, Сомали, Мьянма и Пакистан.

"Беларусь не является приоритетным направлением во внешней политике США. Однако то внимание, которое было оказано белорусскому вопросу в последние годы — принятие Акта о демократии, встречи Кондолизы Райс с белорусскими оппозиционными политиками и представителями гражданского общества, свидетельствует о том, что моральная поддержка существует. И я думаю, что в своей деятельности новый госсекретарь — Хиллари Клинтон — будут опираться на тех людей, которые и ранее занимались белорусским вопросом", — считает заместитель председателя ОГП Ярослав Романчук.

Екатерина ТКАЧЕНКО.

ЗАДУМАЕМСЯ...

За 10 гадоў у Беларусі ў дарожных здарэннях загінула каля 17 тысяч чалавек

Каля 17 тысяч чалавек загінула ў дарожна-транспартных здарэннях за апошнія 10 гадоў. Пра гэта паведаміў Васіль Бульбянкоў, які часова выконвае абавязкі начальніка рэспубліканскай ДАІ.

Паводле яго слоў, павелічэнне колькасці ДТЗ звязана з павелічэннем колькасці транспартных сродкаў у краіне. На дадзены момант іх зарэгістравана амаль 3 мільёны.

У сярэднім на 4 жыхары Беларусі прыходзіцца 1 аўтатранспартны сродак, а ў Мінску дадзены паказчык складае 1 транспартны сродак на 3 жыхары горада, адзначыў Бульбянкоў.

Народная Воля http://www.nv-online.info
21 ЛІСТАПАДА 2008 г.

ПРАБЛЕМА

Чэргі за здароўем

Для таго, каб узяць талон на прыём да ўрача, людзі праседжваюць у паліклініках гадзінамі.

Званок у рэдакцыю

Днямі ў рэдакцыю патэлефанаваў Віктар Карабанаў, які абслугоўваецца ў 34-й мінскай паліклініцы, што месціцца амаль у цэнтры сталіцы, на вуліцы Кульман. Чытач паведаміў: талоны на прыём да дактароў на заўтра выдаюцца пасля 18 гадзін папярэдняга дня, і для таго, каб запісацца на прыём да неўролага, яму прыйшлося займаць чаргу ажно ў дзве гадзіны дня.

"Да нашай паліклінікі нядаўна дабавілі яшчэ нейкія ўчасткі з іншых раёнаў сталіцы, — гаворыць Віктар Фадзеевіч. — *Людзей стала болей, а ўрачоў — не. У паліклініцы "некамплект" спецыялістаў. Для таго, каб узяць талон, людзі праводзяць у чэргах палову дня... Але не факт, што талонаў на заўтра хопіць усім. Як правіла, на кожнага ўрача "адпускаецца" па 10—12 талонаў, і калі ты заняў чаргу, скажам, 15-м, то разлічваць на прыём у доктара на заўтрашні дзень ужо не выпадае... Людзі разварочваюцца, плююцца і сыходзяць, з тым каб прыйсці назаўтра як мага раней і зноў заняць чаргу...*

Што да мяне, то я звярнуўся ў паліклініку 4 лістапада — хацеў трапіць на прыём да неўролага і акуліста. Да неўролага мяне запісалі толькі на 1 снежня, тая ж гісторыя атрымалася і з запісам да акуліста — на снежань. Жарт не жарт, але з такім падыходам, калі да ўрача трапляеш толькі праз месяц, можна да прыёму і не дажыць. А потым медыкі здзіўляюцца, чаму так позна звярнуўся па дапамогу..."

«Пенсіянеры для гэтай дзяржавы як адпрацаваны матэрыял»

З тым каб упэўніцца ў словах нашага чытача, што называецца, на ўласныя вочы, карэспандэнт "Народнай волі" адправіўся ў паліклініку №34.

...Прыехаў я спецыяльна загадзя — за гадзіну да пачатку выдачы талонаў. У холе паліклінікі ўжо знаходзілася каля двух дзесяткаў пацыентаў — у асноўным людзі пажылога ўзросту. Цікава было назіраць: пацыенты дбайна сачылі адзін за адным, і не дай Бог, калі хто накіроўваўся да акна рэгістратуры, спрабуючы "выбіць" талон...

— Жанчына, вы куды, мы ж усе тут у чарзе за талонамі, — амаль адразу з усіх куткоў калідора загучалі злосныя галасы. — *Бачыш, якая дзелавая, талон на заўтра прыйшла браць, я тут з паловы чацвёртай і нічога, чакаю...*

Патроху дыялог ад спраў чыста медыцынскіх выйшаў на сацыяльна-палітычны ўзровень. Знерваваныя людзі не самым добрым чынам узгадалі і Аляксандра Лукашэнку, хаця, як вядома, пенсіянеры — ягоны электарат.

— Пенсіянераў ільгот пазбавіў... Тут і так здароўя ніякага няма. Пенсіі ледзь хапае на самыя танныя лекі, якія не заўжды ёсць у аптэках... Пенсіянеры для гэтай дзяржавы як нейкі адпрацаваны матэрыял — ні павагі, ні годнай старасці... Ды і ў паліклініку гэтую не прабіцца, дактароў не хапае... Замест таго каб лядовыя палацы будаваць, Лукашэнка мог бы і на ахову здароўя грошай падкінуць", — гаманілі людзі.



Выдача талонов на завтра 18.11
осуществляется по очереди и телефонным звонкам с 18.00

Профильные специалисты		Количество талонов на выдачу
Окулист		5
Хирург		6
Уролог		12
Лор		Без талонов
Участковые терапевты		
1 терапевтическое отделение		
зав.отделением:		
Савко[illegible]		
Фицнер Л.В.		7
Розанова Н.Н.		Дежурит
Лис О.М.		[illegible]
Семенов		
2 терапевтическое отделение		
зав. отделением:		
Кобаческая Наталья Васильевна		
Молодьянов В.И		7
Бородкина Е.М.		
Маглыш Р.А.		7
Илюхина З.Н.		7
Жуева		7

Напружаную абстаноўку зняла жанчына ў белым халаце, якая з сумным выглядам сядзела ля стала даведак. Дарэчы, менавіта яна і выдае талоны пацыентам. "Грамадзяне, не шуміце, — катэгарычна заявіла яна. — Талонаў хопіць усім. Іх выдача распачнецца пасля 18.00, як і належыць".

Людзі хоць і супакоіліся, але не вельмі паверылі аб'яве... "Асноўныя сілы" жадаючых атрымаць талон пачалі падцягвацца ў хол паліклінікі прыкладна ў 17.30. Па маіх падліках, ля акна стала даведак утварылася чарга прыкладна з шасцідзесяці чалавек...

Канечне, дапускаючы тое, што не ўсе з гэтай чаргі прыйшлі браць талон менавіта на наступны дзень, можна было б пагадзіцца з тым, што гэтых самых талонаў хопіць усім. Аднак...

Каля стала даведак я заўважыў шыльду. На ёй быў пазначаны пералік прозвішчаў дактароў, а насупраць прозвішча — колькасць талонаў, што будзе выдавацца на заўтра... Рэкардсменам тут быў уролаг — да яго на прыём было ажно 12 талонаў.

"Унучачак, паглядзі, колькі там да акуліста талонаў засталося?" — звярнулася да мяне бабулька. "Пяць", — я разумеў, што мой адказ яе расчаруе. "Зразумела", — цяжка ўздыхнула яна. І зрабіла выснову: "Чаргу займаць няма сэнсу, заўтра зноў прыйдзецца сюды ісці...

ЗАМЕСТ КАМЕНТАРЫЯ

«Сітуацыя звычайная, нічога форс-мажорнага ў гэтым няма»

Каб разабрацца ў сітуацыі, накіраваўся да галоўнага ўрача паліклінікі. **Дзмітрый Шаўцоў** з'яўленню журналіста не здзівіўся, мой дыктафон яго ніколькі не засмуціў...

— З чым звязаны ажыятаж вакол талонаў? Зараз на першым паверсе знаходзіцца каля 60 чалавек?

— Ажыятаж бывае за каўбасой. А ў паліклініку людзі ідуць за здароўем альбо, калі дакладней, яго папраўіць. І я не скажу, што сёння вельмі многа народу, улічваючы, што на календары панядзелак (размова адбылася ў мінулы панядзелак. — Аўт.). Многія захварэлі на выхадных, вось і прыйшлі за талонамі. Так што сітуацыя звычайная. Нічога форс-мажорнага ў гэтым няма...

— Але ж людзі, каб узяць талон на прыём да ўрача, павінны праводзіць у паліклініцы літаральна палову дня…

— Шчыра кажучы, людзі могуць займаць чаргу, калі ім заўгодна. Афіцыйна выдача талонаў распачынаецца ў 18.00. З гэтым ніякіх праблем няма. У нашай паліклініцы выдача талонаў да таго ж тэрапеўта ажыццяўляецца нават у рэжыме "сёння на сёння". Калі чалавек прыйшоў за талонам раніцаю і калі з мінулага вечара засталіся талоны, то тут таксама ніякіх праблем няма. Увогуле прыём пацыентаў, акрамя ўрачоў-тэрапеўтаў, ажыццяўляе і загадчыца аддзялення. І нават калі чалавеку не хапіла талона, ён усё роўна абавязкова будзе прыняты... І вось тыя людзі, якія зараз стаяць у холе, атрымаюць талоны...

— А што тычыцца профільных дактароў — таго ж неўролага? Наш чытач звярнуўся ў вашу паліклініку на пачатку лістапада, а быў запісаны на прыём толькі на снежань. Гаворыць, што можа і не дажыць да прызначанай даты…

— Мы выдаём талоны на прыём да неўролага толькі пасля консультацыі тэрапеўта і адпаведнага назначэння. Вы зразумейце адно: тое, што вырашыў пацыент, маўляў, яму тэрмінова патрэбна трапіць на прыём, і тое, што вырашыў спецыяліст, — розныя рэчы. Калі пацыент па меркаванні доктара можа прайсці агляд у планавым парадку, то яго і запісваюць на вольныя дату і час, а калі пры аглядзе выявіліся сур'ёзныя рэчы і без кансультацыі спецыяліста нельга абысціся, то, як правіла, такі пацыент прымаецца ў самы бліжэйшы час. Здараецца, што кансультацыя патрэбна імгненна, і тады пацыента вузкі спецыяліст прымае без чаргі.

— Не сакрэт, што ў кожнага доктара, які вядзе прыём, колькасць талонаў мае ліміт. Што рабіць пацыенту, які прыйшоў у паліклініку, з тым каб узяць талон на заўтра, а гэтых самых талонаў няма?

— Ізноў жа, усё залежыць ад таго, у якім стане да нас звярнуўся пацыент. У выпадку, калі ён прыйшоў на планавы прыём, — гэта адно. Можна дзень-другі пачакаць. Дарэчы, запісацца на прыём да доктара можна загадзя — тут ніякага ліміту няма. Хоць праз месяц, хоць праз два... А калі ў пацыента рэальна пагоршылася здароўе — у яго ёсць тэмпература, іншыя яўныя сімптомы пагаршэння стану здароўя, то ён абавязкова будзе прыняты. Такіх людзей мы накіроўваем у даўрачэбны кабінет, там ім выпісваюць накіраванне да тэрапеўта, і такога пацыента спецыяліст прымае даволі аператыўна.

— А можа, усё ж такі чэргі — гэта вынік таго, што ў паліклініцы не хапае ўрачоў-спецыялістаў? Ці вашую ўстанову гэтая праблема не закранула?

— На жаль, мы не сталі выключэннем з правілаў. На сённяшні дзень нашая паліклініка абслугоўвае прыкладна 40.000 чалавек, і спецыялістаў рэальна не хапае. Не запоўненыя штатныя стаўкі тэрапеўтаў, нам патрэбны яшчэ адзін акуліст, неўролаг, ЛОР-урач.

— Як вырашыць гэтую праблему?

— У гэтай праблемы ёсць некалькі аспектаў. Не ўсе маладыя спецыялісты хочуць заставацца працаваць у паліклініцы. Нам кожны год размяркоўваюць з медыцынскіх ВНУ маладых спецыялістаў. Нехта застаецца працаваць, нехта сыходзіць, напрыклад, у прыватныя медцэнтры. "Паліклінічны" хлеб вельмі цяжкі. Хоць і заробкі ва ўрачоў крыху павялічыліся і сёння з усімі даплатамі тэрапеўт і можа зарабіць 1.200.000—1.300.000, але маладыя часцяком сыходзяць туды, дзе плацяць больш...

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота аўтара.

ДА ВЕДАМА

Кожны пяты ўрач — пенсіянер

Праблема дэфіцыту ўрачоў існуе не толькі ў паліклініцы №34 г.Мінска. Гэта праблема дзяржаўнага ўзроўню.

Сёння толькі ў Мінску не хапае 2,5 тысячы ўрачоў! А ўсяго па краіне "вакантнымі" застаюцца больш за 5 тысяч урачэбных ставак. Прычым амаль кожны пяты працуючы ўрач — пенсіённага ўзросту.

Начальнік Упраўлення кадравай палітыкі, устаноў адукацыі і знешніх сувязяў Міністэрства аховы здароўя Сяргей Сычык у адным са сваіх інтэрв'ю адзначыў, што праблему кадравага дэфіцыту медыкаў у лепшым выпадку ўдасца вырашыць пасля 2013 года. Дзеля гэтага ўжо з мінулага года павялічыліся наборы ў медыцынскія універсітэты краіны. Выпускнікі-медыкі абавязаны тры гады адпрацаваць па размеркаванні. Прычым зараз на дзяржаўным узроўні разглядаецца пытанне павялічыць тэрмін паслядыпломнай абавязковай адпрацоўкі, ва ўсялякім разе для тых, хто паступаў у ВНУ па мэтавым наборы. Дапамогуць ці не такія непапулярныя і спрэчныя з усялякага пункту гледжання спробы "прывязаць" медыкаў, тэма для асобнага артыкула. Хаця, шчыра кажучы, мала верыцца ў поспех такой ідэі...

Пакуль жа латаць дзіркі недахопу кадраў прыходзіцца за кошт саміх жа медыкаў. У паліклініках урачы працуюць у асноўным на паўтары стаўкі, ва участковых бальніцах нават на 1,62 стаўкі. Такая праца "на знос" на фоне хранічнай грашовай недастатковасці ўсёй галіны аховы здароўя і ёсць галоўная прычына паніжэння якасці медыцынскай дапамогі і незадавальнення пацыентаў, бясконцых чэрг і нерваванняў у той установе, дзе, наадварот, чалавека павінны лячыць не толькі таблеткамі, але і словам. Атрымліваецца, што закладнікамі сітуацыі сталі і пацыенты, і самі медыкі.

ПОДСЧИТАЛИ

Бензин в Беларуси уже дороже, чем в Литве!

Правительство забыло о народе. История с ценами на бензин наглядно продемонстрировала, что белорусские власти заботятся о ком угодно — о госбюджете, о нефтепереработчиках и т.д., но только не о населении собственной страны.

Источник, близкий к Совмину Беларуси, сообщил агентству ПРАЙМ-ТАСС, что правительство изучало возможность в связи с падением мировых цен на нефть снизить цены на горючее на внутреннем рынке. И сочло это нецелесообразным.

Особенно прелестно звучит мотивация этого решения. Снижение цен на нефтепродукты при их реализации на внутреннем рынке неизбежно повлечет за собой пересмотр размера госсубсидий для нефтеперерабатывающих компаний. "А зачем перекладывать деньги из одного государственного кармана в другой?" — отметил чиновник.

В общем, правительство помнит об интересах казны, нефтепереработчиков, о плановых показателях социально-экономического развития и прочих важных вещах. Забыло оно лишь о такой мелочи, как миллионы автолюбителей, регулярно раскошеливающихся на бензин. Побеспокоиться об их карманах чиновникам недосуг. Более того, обосновывая отказ от снижения цен на нефтепродукты, правительственные мужи о простых смертных даже не вспомнили.

В свое время, неоднократно повышая цены на бензин, белорусские власти ссылались на подорожание нефти на мировых рынках. За последние месяцы "черное золото" подешевело более чем в 2 раза. Но, как выясняется, для правительства Беларуси это не повод, чтобы снизить цены на нефтепродукты.

Между тем в Литве за последние месяцы бензин подешевел почти в полтора раза — с 4,40 до 3,4 лита за литр АИ-95. То есть сейчас он стоит около 90 евроцентов. В Беларуси литр 95-го уже "тянет" больше, чем евро! А 92-й бензин стоит, как в Литве 95-й!

В этой связи стоит напомнить как минимум о двух фактах: 1) средняя зарплата в Литве в 2 с лишним раза выше, чем в Беларуси; 2) Литва никогда не рекламировала себя как "государство для народа". Тем не менее об интересах населения там, похоже, помнят лучше, чем в Беларуси.

О том, что цена на бензин в нашей стране завышена, и ранее говорилось неоднократно. Пару месяцев назад известный экономист Леонид Заико в интервью "Салідарнасці" заявил, что литр 92-го должен стоить около 1200 белорусских рублей, и объяснил почему. Тщетно. Белорусские власти остаются глухи к интересам автолюбителей.

Игорь ПОТАПЧУК,
"Салідарнасць".

СЛОВО ВОСЛЕД

Два крыла

В минувший понедельник состоялось прощание с Александром Абрамовичем Дракохрустом.

Он умер в военном госпитале, куда попал совсем не по смертельной болезни, и где, тревожась, находили его друзья, чтобы хотя бы по мобильному телефону — в госпиталь не пускали из-за карантина — поздравить его с 85-м днем рождения.

Но, несмотря на возраст и давний инфаркт, это была внезапная смерть.

В нем не было ни единого признака усталости от жизни. Напротив, он был невероятно внимателен и близок ко всем жизненно важным подробностям бытия, ко всем людям, в которых он обнаруживал хоть толику неравнодушия и таланта. И если в каждодневных записях, прозе его и стихах и проявлялось предчувствие окончания земного пути, то оно было следствием не только глубокого размышления, но и мужественной готовности к неизбежному. Как, наверное, бывает это на войне, которую он прошел от начала до конца.

Есть люди, чей уход, как ни тяжек он для родных и близких, сопряжен лишь с окончанием земного срока и течения лет.



Есть люди, чей уход сопряжен еще и с уходом целого поколения. Потому что они вобрали в себя и выразили всю правду поколения, всю его жизнестойкость, всю его трагедию и боль.

Последними в белорусской литературе, с кем уходило военное поколение, уходили, сменяя друг друга, Наум Кислик, Алесь Адамович, Василь Быков.

Сейчас ушел Александр Дракохруст.

Я чувствую обязанность и долг сказать об этом по праву человека, рожденного в 41-м, по праву принадлежности к поколению, спасенному этими мальчишками, тогда же ушедшими умирать. Поколению, спасенному не только для продолжения физической жизни — для продолжения духовной связи, имеющей источник в том, что называется Совесть. Поколению, спасенному их мужеством и любовью...

Два крыла поднимали их над смертью — Мужество и Любовь.

Сегодня два этих крыла поднимают их над забвением.

Для первой посмертной публикации Поэта мы выбрали два его стихотворения. Первое написано в 1966-м. Второе — из подготовленного к изданию цикла стихов, посвященных Дине Николаевне Манаевой, единственной и на всю жизнь Женщине, Жене, и написанных им после совсем недавней жестокой потери.

Оба они, эти два стихотворения, о Мужестве и Любви.

Сергей ВАГАНОВ.

***

Крестил комбат с отчаянным надсадом
и в мать и в бога наш залегший взвод.
Хватал за плечи — мол, вперед, ребята!
Просил:
— Вперед!.. Иначе — перебьет...
Но мы лежали,
в насыпь вжавшись плотно,
в горячих комьях вспоротой земли.
Умолк сержант. За грудь схватился взводный.
А мы никак подняться не могли.
Упала,
шею вытянув,
граната...
Разрыв. И стон. И пена на губах.
И наша Катька, ППЖ комбата,
вскочила:
— Гады! Вы трусливей баб!..
И только шаг, и только вскрик короткий...
И в нас, парнях,
переборола страх
девчонка эта в выцветшей пилотке,
в зеленых — из брезента — сапогах.
А мы ее, признаться,
звали шлюхой.
Но все бы там погибли, у высот...

Рыдал комбат. Гудели взрывы глухо.
А из пробитой сумки капал йод...

1966

Не разлучит

Бог не внял
безбожной мольбе
и на вдовство обрёк...
Всё равно я приду к тебе,
всё равно я спущусь к тебе —
близок конечный срок.
Что ж, вода и трубы давно
пройдены. И в пути
под конец осталось одно —
через огонь пройти,
чтобы тело исчезло,
чтоб
ветром раздуло дым...
Жди!
Я пеплом лягу на гроб,
ближе к ногам твоим.
Пусть удивит тебя — не беда! —
мой необычный вид,
но никто уже нас тогда
и ничто, и никогда
больше не разлучит!

2008

АКЦЫЯ

Прадпрымальнікі рыхтуюцца да маршу пратэсту

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Перспектыва" падало заяўку ў Мінгарвыканкам на правядзенне 15 снежня ў Мінску маршу прадпрымальнікаў.

У заяўцы ад імя васьмі актывістаў гаворыцца, што мітынгам і шэсцем удзельнікі акцыі хочуць "прыцягнуць увагу ўладаў да невыканальных умоў, якія чакаюць індывідуальных прадпрымальнікаў з 1 студзеня 2009 года".

Лідэр "Перспектывы" Анатоль Шумчанка патлумачыў: *"Мы, як і раней, заяўляем, што гатовы да канструктыўнага дыялогу. І нагнятанне абстаноўкі ў сферы бізнесу сёння, ва ўмовах фінансавага крызісу, не выгадна нікому. Таму мы адмовімся ад правядзення маршу, калі выйдзе ўказ прэзідэнта аб захаванні ранейшых умоў працы для прадпрымальнікаў. А калі не, то ў нас проста не застаецца выйсця".*

Нагадаем, што з 1 студзеня ўлады патрабуюць ад прадпрымальнікаў поўнага мытнага афармлення тавараў, якія ўвозяцца ў Беларусь. Зразумела, што на рынках той жа Масквы, дзе закупляюцца мінскія гандляры, ніякіх дакументаў на тавар ніхто не дае, яны проста не прадугледжаны расійскім заканадаўствам. Такім чынам, з новага года праца індывідуальных прадпрымальнікаў альбо апынецца па-за законам, альбо будзе проста спынена.

СКАНДАЛ

«Уолл стрит Джорнэл» и Александр Лукашенко не поняли друг друга

Министерство иностранных дел Беларуси утверждает, что в материалах американской газеты "Wall Street Journal", которые были опубликованы по итогам интервью А.Лукашенко, была допущена *"абсолютно неверная интерпретация высказываний"* Лукашенко, касающихся планов США по развертыванию системы ПРО в Европе и ответных действий России, включая размещение ракетных комплексов "Искандер".

"Хотел бы подчеркнуть, что Лукашенко не делал никаких заявлений о намерениях нашей страны разместить российские ракетные комплексы "Искандер" в Беларуси в качестве ответной меры на действия США по развертыванию системы ПРО в Европе. В этом очень легко убедиться, сверившись со стенограммой интервью Лукашенко газете "Wall Street Journal", — заявил в воскресенье пресс-секретарь МИД Беларуси Андрей Попов.

По его словам, *"речь шла исключительно о том, чтобы в рамках общего перевооружения белорусской армии постепенно заменить устаревающие ракетные комплексы на новые, более совершенные, включая, возможно, и ракетные комплексы "Искандер"*, что, по мнению МИД Беларуси, *"является делом абсолютно нормальным и естественным для любого государства"* процессом перевооружения.

"Эти намерения нашего государства не являются планами завтрашнего дня. Речь идет о том, чтобы постепенно проводить эту работу, в том числе по мере появления у Беларуси соответствующих финансовых возможностей", — пояснил Попов.

Он признал, что материалы WSJ привели *"к появлению множества домыслов в других средствах массовой информации, которые стали поводом для неверных оценок не только среди экспертов, но и в политических кругах различных государств".*

В своей статье WSJ отметил, что Лукашенко *"полностью поддерживает"* планы России по развертыванию в Калининграде ракет "Искандер", нацеленных на объекты американской ПРО.

"Г-н Лукашенко заявил также, что Россия предлагает разместить ракеты "Искандер" в Беларуси, расположенной между Польшей и Россией. При этом, если соглашения достигнуть не удастся, Беларусь может сделать это самостоятельно, добавил он.

Даже если Россия не предоставит нам эти перспективные ракеты, мы приобретем их сами, — уверяет г-н Лукашенко. По его словам, технологии, лежащие в основе оптики и систем наведения "Искандера", — белорусские. "Сейчас у нас нет на это средств, но получить такое оружие — я сейчас выдам тайну — мы планируем", — заметил он", — написала в пятницу WSJ.

Стенограмма интервью Лукашенко была опубликована на его сайте в минувшие выходные. Учитывая, как тщательно зачищает пресс-служба Лукашенко его высказывания, достоверность или полнота текста стенограммы вызывает определенные сомнения. В то же время аудиофайл беседы Лукашенко с журналистом WSJ к тексту интервью не прилагается. Поэтому сложно сказать, кто ошибся на самом деле.

КАМПЕТЭНТНА

Зянон ЛОМАЦЬ: За прыпіскі трэба прыцягваць да крымінальнай адказнасці

Такую думку выказаў журналістам у Магілёве старшыня КДК Беларусі Зянон Ломаць, які прымаў удзел у калегіі КДК Магілёўскай вобласці.

Нягледзячы на жорсткія патрабаванні, асобныя кіраўнікі ўсё ж спрабуюць прыпіскамі схаваць безгаспадарчасць і няўменне арганізаваць на належным узроўні вытворчасць. "Такіх трэба прыцягваць да крымінальнай адказнасці. Калі яны будуць ведаць, што за прыпіскі могуць трапіць у турму, гэтыя факты будуць практычна выкаранены", — лічыць старшыня КДК.

Такая жорсткая заява, магчыма, звязана з тым, што па афіцыйнай інфармацыі прыпіскі былі выяўлены практычна ў кожнай шостай з правераных гаспадарак Магілёўшчыны. У сувязі з гэтым КДК прапанаваў прыцягнуць да дысцыплінарнай адказнасці кіраўнікоў Бабруйскага, Глускага, Дрыбінскага, Клімавіцкага і Чавускага раёнаў.

Народная Воля http://www.nv-online.info
21 ЛІСТАПАДА 2008 г.

ЧУЛІ?

Беларускі суддзя папрасіў палітычнага прытулку ў Польшчы

Былы старшыня Клімавіцкага раённага суда Ігар Цішкін папрасіў палітычнага прытулку ў Польшчы, паведаміў тэлеканал "Белсат".

"Мы зараз у Польшчы, жывём спакойна, тут нас абараняюць", — сказала журналістам жонка Ігара Цішкіна Ірына.

Свой учынак суддзя патлумачыў ціскам з боку ўладаў Беларусі. Кажа, што спрабаваў супрацьстаяць мясцовым карупцыянерам, якія займаліся кантрабандай спірту ў Расію. Цішкін сцвярджае, што ў гэтых махінацыях задзейнічаны і супрацоўнікі спецслужб, ад якіх былы суддзя не раз атрымліваў пагрозы.

Ігар Цішкін працаваў старшынёй Клімавіцкага раённага суда ў 2000—2007 гадах. Ад гэтай пасады быў вызвалены 1 чэрвеня 2007 года нібыта за парушэнні закону. Яшчэ да з'яўлення ўказа Ігар Цішкін паспеў з'ехаць з Беларусі ва Украіну разам з сям'ёй.

Слуцкія чыноўнікі не дазволілі акцыю, прысвечаную паўстанню 1920 года

Традыцыйная акцыя, прысвечаная Слуцкаму збройнаму чыну, апынулася пад пагрозай зрыву.

Слуцкія чыноўнікі забаранілі мітынг каля гарадскога музея. Нібыта пляцоўка "не прызначаная для правядзення масавых мерапрыемстваў". Аднак шмат гадоў на ёй адзначаліся ўгодкі антыбальшавіцкага паўстання і ніякіх праблем у арганізатараў не ўзнікала.

Нагадаем, акцыя адбываецца ў апошні тыдзень лістапада — у першы тыдзень снежня. Звычайна заяўкі падаюць альбо Партыя БНФ, альбо КХП-БНФ. Сёлета падавала Партыя БНФ і ўпершыню за апошнія гады атрымала адмову. Вось што гаворыць лідэр "Моладзі БНФ" Франак Вячорка:

"Чыноўнікі не прапануюць альтэрнатыўнага варыянту. Не прапануюць мітынг у іншым месцы, а проста адмаўляюць безальтэрнатыўна. У гэтым мы бачым парушэнне закону і збіраемся абскарджваць такое рашэнне спачатку ў райвыканкаме, патрабаваць альтэрнатыўнага месца, а потым падаваць у суд".

Нагадаем, акцыя ў Слуцку была запланаваная на 23 лістапада. І моладзь з Мінска мае намер ехаць у гэты горад у любым выпадку.

КАДРЫ

В Военной академии — новый начальник

Им стал генерал-майор Сергей Бобриков.

Указ о назначении Бобрикова был подписан 13 ноября.

До недавнего времени Сергей Валентинович возглавлял 72-й гвардейский объединенный учебный центр подготовки прапорщиков и младших специалистов Вооруженных Сил Республики Беларусь.

Алина ВЕТРОВА.

СИТУАЦИЯ

Минюст объяснил, почему не зарегистрировал организацию пенсионеров. Независимый эксперт не согласен с доводами чиновников

Министерство юстиции заявило, что общественному объединению белорусских пенсионеров "Наше поколение" было отказано в регистрации в связи с установленными фактами фальсификации предъявленных документов. Эту новость сообщило в понедельник информационное агентство "Интерфакс".

Инициаторы создания "Нашего поколения" категорически не согласны с подобными заявлениями. Чтобы расставить точки над "і", мы попросили прокомментировать заключение Минюста независимого юриста. Но сначала несколько слов о решении Министерства юстиции, которое появилось 17 октября.

Как известно, Минюст отказал в регистрации общественному объединению белорусских пенсионеров "Наше поколение". Основанием для принятия такого решения послужило якобы то, что, по мнению сотрудников Минюста, инициаторы создания организации не представили в министерство протокол учредительной конференции, проходившей в г.Минске. Кроме того, Минюст указал, что на учредительной конференции не присутствовали учредители от Брестской области В.Е.Панковец и Е.А.Кулай. И наконец, третья причина: отсутствие в пакете документов договора (счет-фактуры) с соответствующим печатным средством массовой информации об опубликовании после государственной регистрации объединения сообщения о полном и сокращенном его названии, дате государственной регистрации, регистрационном номере, юридическом адресе и контактном номере телефона.

Это, так сказать, официальная позиция. А вот мнение независимого эксперта.

— Из представленных лидером "Нашего поколения" Татьяной Зелко документов и текста официального отказа Министерства юстиции можно сделать вывод, что этот самый отказ носит скорее формальный характер, — убежден юрист международной организации HRD Андрей ДЕМИДОВИЧ. — Но обо всем по порядку.

Первое, на что указало министерство... на описку в самом заявлении о государственной регистрации. Инициаторы "Нашего поколения" неверно указали место, где проводилась учредительная конференция — вместо "г.п.Радошковичи" указали "г.Минск". Министерство юстиции из этой описка сделало целую историю, посчитав, что это вовсе не опиской, а то, что инициаторы вдруг решили провести зачем-то аж две учредительные конференции. Причем протокол из г.Минска специально не предоставили на рассмотрение в Министерство юстиции. Совершенно очевидно, что данная причина носит устранимый характер, и в соответствии с ч.1 ст.15 "Закона об общественных объединениях" Министерство юстиции обязано было приостановить процедуру регистрации и предоставить срок на исправление этой неточности.

По мнению Министерства юстиции, следующая причина не носит устранимого характера. Как следует из отказа, *"проведенной проверкой установлено, что на учредительной Конференции... от Брестской области фактически присутствовали лишь 8, а не 10 человек"*. Действительно, данная причина является неустранимой. Здесь, безусловно, есть как моральная, так и юридическая составляющая вопроса. Каким образом проводилась проверка, и имела ли она шанс иметь иной результат, оставим на совести министерства. Меня, как юриста, заинтересовало другое. На конференции были представлены все регионы Беларуси, кроме Гродненской области. В соответствии с абзацем 3 ч.4 ст.8 Закона Республики Беларусь "Об общественных объединениях" для создания и деятельности в Республике Беларусь республиканского общественного объединения необходимо наличие не менее чем по десять учредителей (членов) от большинства областей Республики Беларусь и города Минска. Даже если предположить, что от Брестской области два человека не участвовали, все равно конференция была достаточно представительной для регистрации Республиканской общественной организации. То есть данная причина является абсолютно надуманной, и даже если принять ее на веру, то она не может служить основанием для отказа в государственной регистрации.

И последнее, о чем говорится в отказе в государственной регистрации. Вместо того чтобы предоставить договор с газетой, где будет напечатано объявление о регистрации, инициаторы предоставили квитанцию об оплате этого объявления. Данная причина также носит устранимый характер, о котором мы уже говорили. Хотя, если говорить откровенно, если Министерство юстиции отказывает по данной причине в регистрации, то пускай они изменят текст в "Перечне документов" на своем сайте. Среди всего прочего там написано, например: "Документ об оплате за сообщение о государственной регистрации общественного объединения, союза в периодическом печатном издании, определенном актами законодательства". Я, конечно, не бухгалтер, но, по-моему, это точно не договор.

Таким образом, можно с уверенностью сказать, что отказали ООБП "Наше поколение" в государственной регистрации по формальным причинам, ничего не имеющим общего с законодательством.

К слову

Отказ в регистрации общественному объединению пенсионеров — не прецедент в нашей стране. В 2006 году так же безуспешно пыталась зарегистрироваться в Министерстве юстиции еще одна организация пенсионеров — "Старейшины". И тоже получила от ворот поворот в Минюсте: в поданных на регистрацию документах были найдены технические ошибки. Инициаторы создания "Старейшин" попытались оспорить данное решение в суде, однако Верховный суд признал его правомочным.

В прошлом году руководство организации раскололось, и все инициаторы выстраивали свою политику в отношении белорусских пенсионеров самостоятельно. Лидеры "Старейшин" публично отказались от этой деятельности, лидеры новой организации "Наше поколение" приняли кардинальное решение работать дальше. Но, оказалось, что и у новой организации пока не получилось зарегистрироваться в Министерстве юстиции...

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ГРАМАДСКІ СУД

Сталінізм не павінен мець шанцаў на аднаўленне

Вы чулі пра грамадскі трыбунал па разглядзе злачынстваў сталінізму ў Беларусі? Так, ёсць такі. У яго складзе вядомыя людзі — Леанід Акаловіч, Якаў Басін, Анатоль Белы, Анатоль Валахановіч, Марат Гаравы, Ігар Кузняцоў, Леанід Маракоў, Уладзімір Раманоўскі, Вячаслаў Сіўчык, Зінаіда Тарасевіч, Сяргей Ханжанкоў, Уладзімір Халіп, Георгій Штыхаў, Васіль Якавенка. Сярод іх ёсць і святар, і гісторык, і рэжысёр, і пісьменнік, і... чалавек, які нарадзіўся ў ГУЛАГу...

Нядаўна грамадскі трыбунал вынес на публічнае абмеркаванне чарговае абвінавачанне заключэнне па злачынствах сталінізму ў Беларусі. Вось радкі з дакумента:

"У 1920—1940-я гады была рэпрэсавана значная частка насельніцтва СССР. Згодна з афіцыйнымі дадзенымі, толькі ў БССР рэпрэсавана больш за 600 тысяч чалавек (па падліках незалежных даследчыкаў — не менш за мільён).

У першыя гады пасля ўсталявання савецкай улады ў краіне праводзілася вынішчэнне цэлых груп насельніцтва па класавай і саслоўнай прыкмеце: буйная буржуазія, афіцэры царскай арміі, святары і заможнае сялянства.

Потым палітыка генацыду была працягнута ў нацыянальна-культурнай сферы. Прыціск і ліквідацыя нацыянальных супольнасцяў, дыскрымінацыя нацыянальных і рэлігійных традыцый, знішчэнне гістарычных помнікаў, музеяў і культавых пабудоў, трыумф рускага вялікадзяржаўнага шавінізму, паскораная урбанізацыя і выцясненне нацыянальных моў з усіх сфер жыцця, у тым ліку адукацыйных устаноў і справаводства, фізічнае знішчэнне вялікай часткі творчай і навуковай інтэлігенцыі — **усё гэта прывяло да значнага разбурэння нацыянальных каштоўнасцяў, традыцыйнай рэлігіі і культуры большасці народаў БССР, у першую чаргу тытульнай нацыі — беларусаў.** Становішча да гэтага часу не выпраўлена.

У ілюзорнай спробе стварэння нейкага новага тыпу савецкага чалавека краіне была навязана гвалтоўная асіміляцыя і русіфікацыя этнасаў, скіраваная на вынішчэнне іх духоўнага жыцця.

Рэалізацыя ідэі татальнай неадкладнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі прывяла не толькі да голаду і Галадамору, у выніку якога загублены мільёны жыццяў, але і да масавага працяглага рабавання і вынішчэння сялянства ў цэлым як самавітай, прафесійна, культурна і духоўна ўзбагачанай катэгорыі вытворцаў.

Толькі ў БССР было раскулачана больш за чвэрць мільёна чалавек. Улады давялі да галечы і разбурылі не менш за 80% рэнтабельных індывідуальных гаспадарак, чым падарвалі асновы ўсёй сельскагаспадарчай вытворчасці ў Беларусі, якую так і не ўзнавілі ў наступныя 70 гадоў..."

Грамадскі трыбунал робіць наступныя высновы:

"Вынікі рэпрэсіўнай палітыкі бальшавіцкай улады трагічныя: за кароткі гістарычны перыяд **кожны восьмы** жыхар Беларусі апынуўся за кратамі ці калючым дротам, **кожны пяты** быў дыскрымінаваны, пазбаўлены грамадзянскіх правоў ці то як "прадстаўнік непрацоўнай часткі насельніцтва" ("лішэнец"), ці як член сям'і міфічнага ворага народа — "шпіёна, дыверсанта". У шэрагу населеных пунктаў у выніку масавых савецкіх рэпрэсій загінула жыхароў больш, чым за перыяд нацысцкай акупацыі.

За бязглуздую і бяздарную спробу кіраўніцтва паставіць насельніцтва вялізнай краіны на калені аслабленая рэпрэсіўная дзяржава СССР панесла страшэнныя страты ў гады Другой сусветнай вайны — дзесяткі мільёнаў загінуўшых, мільёны ваеннапалонных, сотні тысяч калабарантаў, невярталнікаў з лагераў перамешчаных асоб.

Страх перад сваім народам прымусіў Іосіфа Сталіна навязаць краіне чарговую хвалю тэрору пасля заканчэння вайны. *"Мы победили в войне, но страну надо держать в мобилизационной готовности"*, — заявіў правадыр, прыступіўшы да падрыхоўкі *"канчатковай перамогі сацыялізму ва ўсім свеце"*.

...Незавершаны працэс дэсталінізацыі на постсавецкай прасторы стварае глебу для перыядычных спроб рэабілітацыі сталінізму і ягонага гістарычнага лідэра.

90-годдзе кастрычніцкага перавароту 1917 года і 70-годдзе трагедыі 1937-га адзначаны выпускам вялікай колькасці апалагетычнай літаратуры, фільмаў і тэлепраграм, якія апраўдваюць злачынствы таталітарнага бальшавіцкага рэжыму. Крывавы ўрок мінулага дагэтуль так і не асэнсаваны дзецьмі і ўнукамі тых, хто стаў ахвярамі злачыннай улады.

Грамадскі трыбунал па разглядзе злачынстваў сталінізму ў Беларусі:

— **канстатуе,** што без справядлівага суда нашчадкаў над дзяржаўнымі злачынцамі немагчыма станаўленне прававой дзяржавы;

— **падкрэслівае** важнасць далейшага ўвекавечвання памяці ахвяраў сталінізму і шырокага грамадскага абмеркавання яго наступстваў дзеля таго, каб грамадства прыйшло да ўсведамлення і пакаяння за вольны ці міжвольны ўдзел у злачынствах таталітарнага рэжыму.

Статуты Нюрнбергскага і Такійскага ваенных трыбуналаў, Жэнеўская канвенцыя 1948 года "Аб папярэджанні злачынстваў генацыду і пакаранні за яго", нацыянальнае заканадаўства ўстанаўліваюць міжнародную



крымінальную адказнасць асоб, вінаватых у ажыццяўленні генацыду, незалежна ад іх грамадскага становішча, а таксама незалежна ад таго, здзяйсняецца генацыд у мірны ці ў ваенны час.

Суд над генацыдам і асобамі, вінаватымі ў яго ажыццяўленні, у выкананні тэрору, можа адбыцца ў любой дзяржаве — удзельніцы Канвецыі або ў Міжнародным крымінальным трыбунале, створаным дзеля гэтага пагадненнем дзяржаў.

Гэта злачынства не мае тэрміну даўніны.

Сталінізм не павінен мець шанцаў на аднаўленне.

Краіна, якая не можа ці не хоча адкрыта асудзіць памылкі свайго недалёкага мінулага, асуджана на іх паўтор у будучым".

ПАЛІТКУХНЯ

Магілёўскія дэмакраты патрабуюць адстаўкі сустаршыняў АДС

У Магілёве адбыўся справаздачна-выбарчы сход абласной кааліцыі Аб'яднаных дэмакратычных сіл. На ім былі прынятыя дзве рэзалюцыі, у адной з якіх дадзена ацэнка працы кіраўніцтва АДС.

Як распавёў кіраўнік абласной арганізацыі Партыі БНФ Рыгор Кастусёў, большасць дэлегатаў палічыла працу кіраўніцтва АДС нездавальняючай. *"Мы далі ацэнку кіраўніцтву АДС. Далі ацэнку працы кіраўніцтва — сустаршынь. І большасць дэлегатаў прагаласавала за нездавальняючую ацэнку працы з патрабаваннем іх сыходу ў адстаўку"*.

Найперш гэта звязана з кепскай падрыхтоўкай да парламенцкіх выбараў, кажа Рыгор Кастусёў.

КАРУПЦЫЯ

Фінансавая міліцыя таксама любіць грошы

Судом Салігорскага раёна разглядаецца справа па абвінавачванні двух супрацоўнікаў фінансавай міліцыі ў атрыманні хабару шляхам вымагання па папярэдняй змове ў асабліва буйным памеры (ч.3 арт.430 КК).

Як паведамілі БелаПАН у Генеральнай пракуратуры, устаноўлена, што адзін з фігурантаў, працуючы з 2001 года па верасень 2007 года старшым інспектарам Бабруйскага міжрайаддзела ўпраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці, а з верасня 2007 года -- начальнікам Горацкага міжраённага аддзела УДФР, па папярэдняй змове з калегам, які працаваў з 2001-га па май 2007 года следчым Бабруйскага міжрайаддзела УДФР, а з мая 2007 года -- старшым інспектарам дадзенага аддзела, у перыяд са жніўня 2004 года па 11 кастрычніка 2007 года сістэматычна атрымлівалі хабар ад вядучага спецыяліста адной з замежных фірм. Хабар яна перадавала супрацоўнікам фінансавай міліцыі ў сувязі з тым, што апошнія пагражалі выкарыстаць сваё службовае становішча і зрабіць немагчымым ажыццяўленне фірмай гандлёва-пасярэдніцкай дзейнасці на тэрыторыі Бабруйска і Бабруйскага раёна.

Усяго імі было атрымана хабару на агульную суму 16 тысяч долараў ЗША.

Дзяржаўны абвінаваўца прапанаваў суду прызначыць падсудным пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 12 і 14 гадоў адпаведна, з канфіскацыяй маёмасці, з пазбаўленнем права займаць пасады, звязаныя з выкананнем выканаўча-распарадчых функцый на тры гады, а таксама з пазбаўленнем спецыяльных званняў падпалкоўніка фінансавай міліцыі і маёра фінансавай міліцыі адпаведна.

Вынясенне прыгавору па дадзенай справе чакаецца ў канцы лістапада.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Скандал у Дэпартаменце фінансавых расследаванняў

Супрацоўнікі Камітэта дзяржбяспекі затрымалі ў Віцебску аднаго з кіраўнікоў упраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Віцебскай вобласці ў момант атрымання хабару ў памеры 5000 долараў.

Аб гэтым паведамілі агенцтву "Інтэрфакс-Захад" у Цэнтры інфармацыі і грамадскіх сувязяў (ЦІГС) КДБ.

Па звестках супрацоўнікаў КДБ, грошы прызначаліся за спрыяльнае рашэнне пытання аб паніжэнні штрафных санкцый, накладзеных на індывідуальнага прадпрымальніка па выніках праверкі ягонай фінансава-гаспадарчай дзейнасці. "Узбуджана крымінальная справа па частцы 3 арт.430 КК Беларусі ("Атрыманне хабару")", — адзначылі ў КДБ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
21 ЛІСТАПАДА 2008 г.

Глядзіце, спадар Лукашэнка, у корань!

Ужо колькі дзён і тэлебачанне, і радыё, і газеты смакуюць выступленне Аляксандра Лукашэнкі на нарадзе па пытаннях барацьбы з карупцыяй. Пры гэтым падаецца ўсё так, быццам зараз зямля будзе гарэць пад нагамі тых, хто злоўжывае службовым становішчам, грэе рукі на розных махінацыях. Людзей, далёкіх ад палітыкі, невысокага інтэлекту, пасіўных, пераконваюць у тым, што калі сам прэзідэнт узяўся за выкарчоўванне вялікага зла, то гэта абавязкова будзе зроблена.

Такім просталюдзінам я хачу адкрыць вочы: нічога не будзе! Памятаеце антыкарупцыйны даклад А.Лукашэнкі падчас яго дэпутацтва ў Вярхоўным Савеце? У каго з тых, каго ён абвінавачваў у вялікіх грахах, упала з галавы хоць адна валасінка? Наадварот, многіх з тых, каму ён даваў, як кажуць, у хвост і ў грыву, прыгрэў, калі сам прыйшоў да ўлады.

Аляксандр Рыгоравіч, трэба глядзець у корань, а не пускаць людзям пыл у вочы. Наладжвайце хоць кожны дзень "тэлеспектаклі", здымайце пачкамі з пасад высокіх чыноўнікаў, а карупцыя будзе цвісці і множыцца. Да таго часу, пакуль дзяржава не выкараніць прычыны, якія яе, карупцыю, падкормліваюць. Сёння кроку не ступіш без таго, каб не звярнуцца да таго ці іншага начальніка за дазволам, паперкай, узгадненнем... Колькі гаворыцца пра раздзяржаўленне многіх галін эканомікі, а зрухаў, лічы, ніякіх. У краіне быў асноўным уласнікам чыноўнік — ён ім і застаўся. А калі пры гэтым чыноўнік адчувае яшчэ і беспакаранасць, мае доступ да таго, што яму хочацца мець, — ён ідзе на ўсялякія парушэнні законаў.

Ёсць карупцыя і на Захадзе, але ўсё ж яна там больш выкрываецца, а таму і шкода ад яе меншая. Не трэба вынаходжваць веласіпед, не трэба бубніць пра нейкі свой, беларускі, шлях развіцця. Не валодаюць на Захадзе чыноўнікі неабмежаванай уладай — пазбаўце яе іх і ў нас. Як злыя сабакі накідваюцца там журналісты на тых, хто пайшоў супраць законаў, — дайце свабоду беларускім журналістам, і яны стануць своеасаблівымі санітарамі.

Яшчэ раз паўтараю: глядзіце, спадар Лукашэнка, у корань, тады, можа, нешта і атрымаецца.

Рыгор Іванавіч ЯНЧУК,
чалавек, які ўмее думаць.

Глушаць праўду

Раней перадачы Радыё Свабода ў Мінску даходзілі да слухачоў больш-менш нармальна. А з 1 кастрычніка яны глушацца штодзённа і з нейкай небывалай шалёнасцю. Вядома, гэта робіцца з тым, каб людзі не ведалі праўду.

Сяргей БАРЫСАЎ.
г.Мінск.

ЗВАНОК У КАМІТЭТ ДЗЯРЖАЎНАЙ БЯСПЕКІ

"Народная воля" запыталася ў кіраўніка Цэнтра інфармацыі і грамадскіх сувязяў КДБ Валерыя Надтачаева: "Ці глушыць КДБ Радыё Свабода?"

"Гэта інфармацыя не адпавядае рэчаіснасці", — коратка адказаў Валерый Надтачаеў.

А факт застаецца фактам: у Мінску, ды, мабыць, і ў іншых месцах, перадачы Радыё Свабода даходзяць да слухачоў з вялікімі тэхнічнымі памехамі.

РЭХА

Бляск перамогі пад Грунвальдам не зацьміць вякам

Не сумняваюся, пра гістарычную перамогу 1410 года пад Грунвальдам чулі многія. Ну як жа, там нашы ліцвіны і палякі супольна разграмілі ўшчэнт тэўтонскае нашэсце. Але вось сэнс гэтай вялікай падзеі ўсведамляюць далёка не ўсе: маўляў, калі тое было -- ужо амаль шэсць стагоддзяў мінула, ці мала чаго пасля гэтага адбылося на нашай зямлі...

Але ёсць рэчы, з'явы, падзеі, не падуладныя забыццю. Іх значэнне ў жыцці нацыі, развіцці дзяржавы не прыцямняецца з цягам часу. Падумаць толькі: нашы гераічныя продкі на чале з Вялікім князем Вялікага княства Літоўскага Вітаўтам і польскім каралём Ягайлам далі такога дыхту агрэсіўным крыжакам, што тыя ажно паўтысячы год не адважваліся ступаць на нашу зямлю. Бальшыня адважных ваяроў былі нашы землякі, хіба тое не з'яўляецца гонарам і прыкладам для ўсіх, каму дарагая воля і шчасце Бацькаўшчыны? Наўрад ці хто стане абвяргаць, што і Вялікая Перамога 1945 года над гітлераўскім фашызмам бярэ выток у той сівой даўніне...

Як жа мы ўшаноўваем гістарычную дату найвялікшага значэння? Так, гэта добра, што асобныя (на жаль -- менавіта асобныя) грамадскія аб'яднанні, гісторыкі, даследчыкі мінуўшчыны імкнуцца данесці веды і раскрыць велізарную ролю славутай бітвы ў жыцці многіх пакаленняў нашай краіны, у стварэнні, ушанаванні і адстойванні незалежнасці краіны. Даўно наспела і пераспела пытанне аб неабходнасці святкавання перамогі пад Грунвальдам на шырокім дзяржаўным узроўні, вывучэння яе ў вучэльнях усіх узроўняў, у тым ліку і вайсковых. Вось на такіх падзеях трэба выхоўваць патрыётаў Айчыны, а не на бутафорскай "лініі Сталіна".

...Пасля Грунвальда многія ваяры з крымскіх татар, што ўдзельнічалі ў бітве на нашым баку і паказалі сябе з найвыдатнейшага боку, засталіся ў Вялікім княстве, сталі жыць побач з нашымі прашчурамі як браты. І да сёння іх святыя кнігі "Аль-Кітаб" захавалі і данеслі да нас у напісаных па-арабску літарах усё багацце і сакавітасць жывога тагачаснага ліцвінскага слова. Многія з тых старадаўніх слоў і зараз ва ўжытку, занатаваны ў слоўніках... Факт, варты пашаны і захаплення!

Ці трэба казаць, што я ўсёй душой падтрымліваю апублікаваны ў "Народнай волі" зварот Мінскага культурна-асветнага клуба "Спадчына" да кіраўніцтва краіны з тым, каб прыгожа і годна, усім народам адсвяткаваць 600-годдзе вялікай бітвы, бляск якой не зацьміць вякам і бяспамятным людзям. 2010 год ужо блізка!

Мікола ЛАВІЦКІ,
сябра
ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны".

ПА ЧУТКАХ І...

На пенсію ў 62 з паловай гады?

Наколькі маюць рацыю тыя, хто сцвярджае, што ў Беларусі афіцыйна прапаноўваецца павялічыць пенсіённы ўзрост для жанчын і мужчын?

На мінулым тыдні адразу з некалькіх крыніц паступіла інфармацыя, што быццам бы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі накіравала на ўзгадненне ў Федэрацыю прафсаюзаў прапанову павялічыць пенсіённы ўзрост для мужчын і жанчын да 62,5 года.

Аднак ні ў Федэрацыі, ні ў міністэрстве гэтую інфармацыю не пацвердзілі.

— Дакладна магу сказаць, што за апошнія паўгода з падобнай ініцыятывай ў Федэрацыю прафсаюзаў ніхто не звяртаўся, — упэўнена адказала прэс-сакратар арганізацыі Вольга ЗУЁНАК.

— Упершыню ад вас чую пра такую прапанову, — такой была рэакцыя на наш тэлефонны званок начальніка аддзела заканадаўства Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ларысы ЯШКАВАЙ. — Ды і не можа яе быць ўвогуле на дадзены момант.

Трэба сказаць, што чуткі аб тым, што пенсіённы ўзрост у Беларусі можа быць павялічаны, узнікаюць з пэўнай перыядычнасцю. Толькі тэрмін выхаду на пенсію для мужчын і жанчын называецца розны. Напрыклад, у маі гэтага года начальнік аддзела развіцця пенсіённай сістэмы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна ПАГОНЫШАВА заявіла, што мэтазгодна было б павялічыць пенсіённы ўзрост для жанчын і падраўняць яго з мужчынскім.

Прэса імгненна адрэагавала на гэтую заяву. Аднак да афіцыйных прапаноў справа не дайшла...

Дарэчы, як і ў савецкія часы, жанчыны выходзяць на пенсію ва ўзросце 55 гадоў, а мужчыны — 60 не толькі ў Беларусі. Такі ж падыход у вызначэнні пенсіённага ўзросту захаваўся таксама ва Украіне і Расіі.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

КРИК ДУШИ

Завтра мы можем не справиться с последствиями алкоголизации населения

Темой алкоголизации в силу своей профессии занимаюсь давно. Полагаю, что достаточно зрелый возраст (мне слегка за пятьдесят), образование (кандидат наук) и твердая гражданская позиция дают мне право выразить свое отношение к затронутой проблеме.

Даже скромные подсчеты показывают, что в нашей стране не менее 1,5 млн человек (некоторые мои коллеги настаивают на большем), что составляет около 15% населения, имеют разные степени алкогольной зависимости. Тяжесть заболевания едва ли имеет принципиальное значение, тем более что при отсутствии лечения болезнь неизбежно прогрессирует. Нормой, если такое понятие вообще применимо к наркотической зависимости (алкоголь хоть и не героин, но тоже сильный наркотик), считается, когда число таких "страдальцев" в популяции не превышает трех процентов. Необратимая деградация генофонда нации начинается с потреблением пяти-шести литров чистого спирта в год на каждого жителя, включая древних стариков и новорожденных. Иногда эту планку чуть приподнимают — не более 8 литров в пересчете на чистый этиловый спирт. Такое количество алкоголя белорусы потребляли лет двадцать назад, но уже тогда пьяниц было слишком много. Сегодня в Беларуси потребляется около 13 литров спирта в год на человека.



Согласно официальным данным с поправкой на 10%-ный прирост заболеваемости за прошедший год в Беларуси около 280 тысяч человек страдают хроническим алкоголизмом, из них не менее 25 тысяч — несовершеннолетние. Последние состоят на учете без соответствующей записи в медицинской карточке по причине малолетства, но от этого никому легче не становится.

Что касается пива, то при нашей так называемой "северной культуре" питья оно никак не может стать заменителем крепких спиртных напитков. Пиво скорее служит надежным трамплином для гарантированного приобретения алкогольной зависимости подрастающим молодым поколением с последующим переходом к употреблению более крепкой продукции. Белорусская статистика это подтверждает как нельзя лучше. В 2000—2005 годах при сокращении производства водки и "чернил" и увеличении продажи пива на 50% число алкоголиков в стране выросло в два раза. Как-то не похоже, что это удвоение является следствием профессионального рвения милиции и наркологов. Основную долю "новоиспеченных" составили женщины, молодежь и подростки. Что ж, если пиво у нас, как младенцы соску, потягивают все и везде. Дети благопристойных родителей тянут его упаковками или распивают прямо на ступеньках школ. Навязчивые рекламодатели и лояльная белорусская торговля подсчитывает барыши, забывают поставить в известность свои будущие жертвы, что пивной алкоголизм по последствиям тяжелее водочного и почти не поддается лечению. Внутренние органы любителей этого хмельного напитка (сердце, печень, гормональная система) могут серьезно пострадать задолго до появления сформировавшейся зависимости. А уже молодые парни с отвисшими пивными животами, расплывшимися бедрами и бесформенными плечами едва ли смогут доставить эстетическое наслаждение женскому глазу. Правда, ситуация "выправляется". Женщины и девушки активно приобщаются к питию с соответствующими последствиями. Пьющие друзья и спутники жизни становятся для них нормой. Не потому ли сегодня государство воспитывает 32 тысячи сирот при живых родителях, а еще, со слов Лукашенко, 36 тысяч детей необходимо срочно изымать из семей? Догадайтесь с первого раза почему?

И снова неумолимая статистика. Половина воспитанников детских домов будет пить, каждый пятый, если не четвертый, попадет за решетку, еще столько же уйдут из жизни по собственной воле. Выкарабкаются из своего родословного болота единицы.

Мужчина с приобретенной алкогольной зависимостью с огромной вероятностью (по разным оценкам в 60-85% случаев) производит на свет такого же сына. Даже полная изоляция в младенческом возрасте ребенка от отца-алкоголика мало улучшает эту страшную статистику. В свое время в сельской школе, где учился мой бывший муж, не было ни одного ребенка с ограниченными умственными способностями. Сейчас организован класс для таких детей. Что-то вроде детского сада при школе для несчастных, лишенных разума чаще всего по вине пьющих родителей.

Я уже писала выше: в Беларуси потребляется около 13 литров спирта в год на человека. Если смотреть правде в глаза, опасный Рубикон мы перешли в начале девяностых годов прошлого столетия. Сегодня мы живем в режиме самоуничтожения. Если этот процесс не остановить, завтра мы не справимся с валом тяжелейших последствий алкоголизации. Некому будет рожать здоровых детей и растить осиротевших, некому будет честно трудиться и защищать свое Отечество. Конечно, найдутся те, кто прихватив награбленное, спрячется от проблем за бугром, но большинству из нас бежать некуда.

Н.БУЛАНКИНА,
кандидат наук.

Минск.

Што можа канчаткова адсячы Беларусь ад заходняга свету і падштурхнуць у абдымкі ўсходняга суседа

Калі вышэйшыя ўлады Беларусі прызнаюць Паўночную Асецію і Абхазію — гэта будзе здрада ўласнаму народу. Такое рашэнне адсячэ Беларусь ад заходняга свету і падштурхне ў абдымкі ўсходняга суседа.

З пункту гледжання свабоды і незалежнасці прызнанне Паўночнай Асеції і Абхазіі бессэнсоўна, невытлумачальна. Чаму мы павінны ахвяраваць сабою дзеля чыіхсьці інтарэсаў, калі ў свеце існуе моцны контрінтарэс? Навошта нам класціся пад камень жорнаў?

Можа спрацаваць прымітыўная кемлівасць — мы іх прызнаем, а нам Расія ў 2009 годзе будзе прадаваць газ па нізкіх коштах, як быццам наступны год — канец свету! Калі не, дык навошта ганьбіць сябе перад усім дэмакратычным светам?

Мікалай РАБЕКА.

г.Мінск.

Навошта чорнае выдаваць за белае?

Чытаеш дзяржаўную прэсу і дзіву даешся: з якой помпай падаюць заідэалагізаваныя журналісты той ці іншы факт.

На нядаўнім пасяджэнні Прэзідыума Савета міністраў Рэспублікі Беларусь вялася, скажам, гаворка пра выкананне праграмы забеспячэння патрэб краіны ўласнай агароднінай прадукцыяй.

Адзначалася, што фактычнае спажыванне гародніны ў 2007 годзе склала 138 кілаграмаў пры норме на аднаго чалавека 126 кілаграмаў.

Лукашэнкаўскія газеты пішуць пра гэта як пра нейкае дасягненне. Нікому з заангажаваных журналістаў і ў галаву не прыходзіць паставіць пытанне: а якая ж тут заслуга дзяржавы?! Сапраўды, у 2007 годзе па дадзеных Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь у краіне было сабрана 2153 тысячы тон агародніны. Пры гэтым сельскагаспадарчыя і другія арганізацыі сабралі 299 тысяч тон, ці 13,9 працэнта ад агульнай лічбы, гаспадаркі насельніцтва — 1775 тысяч тон, ці 82,4 працэнта, фермерскія гаспадаркі — 79 тысяч тон, альбо 3,7 працэнта. Як бачна з прыведзеных лічбаў, дзяржава фактычна пераклала на плечы самога насельніцтва праблему забеспячэння гароднінай. Тут бы дзяржаўнай прэсе забіць у званы: а чаму калгасы і саўгасы так слаба вырошчваюць агародніну? Можа, іх наогул трэба распусціць?

На міжсезонны перыяд у стабілізацыйныя фонды закладзена 27,9 тысячы тон капусты, ці па 3,9 кілаграма на аднаго гарадскога жыхара, па 1,8 кілаграма морквы, па 1,5 — буракоў, 1,6 — цыбулі. І гэта на шэсць месяцаў (лістапад—красавік). Вось чаму ўжо ў красавіку даводзіцца завозіць такія віды гародніны, як морква, буракі, капуста, для вырошчвання якіх у Беларусі самыя спрыяльныя глебава-кліматычныя ўмовы.

Дык пра якія поспехі можна гаварыць? Навошта чорнае выдаваць за белае?

Пётр РОГАЧ,
пенсіянер.

Мінск.

БОЛЬ

Без памяти человек — не человек

...Ребенком я видел, как фашисты увозили из Витебского гетто на расстрел в Туловские овражки узников, а затем, пряча свои зверства, заливали могилы жертв кислотой и сжигали человеческие останки. Детдом, где я тогда находился, стоял на улице Фрунзе, и когда смрадный ветер дул со стороны Тулова, дышать было невозможно...

На глазах горожан происходила страшная трагедия и в лагере смерти "5-й полк", где погибло более 100 тысяч военнопленных и мирных граждан. До сих пор это страшное место — память пережитого нашим народом — фактически заброшено властями: ни надлежащего благоустройства, ни мемориала, хотя известно, что проект давно готов. Видимо, не хватает денег, хотя они находятся на мифическую "Линию Сталина", которая, по рассказам ветеранов, не защитила нашу землю от гитлеровского нашествия. Не секрет, что всего через 6 суток после начала войны немцы уже были в Минске.

Конечно, очень хорошо, что глава государства А.Лукашенко совершил, наконец, беспрецедентный шаг — посетил мемориал погибшим в Минском гетто в скорбный день 65-летия его уничтожения. Он заявил, что и в известном миру месте массового уничтожения людей — Тростенце — будет возведен мемориал в память жертв Холокоста.

Однако сколько на нашей многострадальной земле мест, где лежат безвинные жертвы, и память загубленных до сих пор не увековечена? До сих пор вы не найдете в Беларуси памятника жертвам сталинских репрессий. Таких мест, обильно политых кровью наших же граждан, только в Минске чуть не с десяток, а сколько в разных городах? Об этом молчит официальная пропаганда, как будто пуля энкавэдиста более "ласкова", чем гитлеровская...

Далеко за пределами нашей страны люди доброй воли знают о Куропатах, где нашли мученическую смерть десятки и десятки тысяч ни в чем не повинных граждан. Среди них — известные поэты и трудолюбивые пахари, талантливые юноши и убеленные сединами старцы. Они честно жили, честно делали свое дело — и внезапно, ни за что ни про что были выхвачены из нелегкой, но привычной жизни, поставлены на край могилы под наганы палачей. Скажите, кто и когда из руководства страны попросил за эти совершенные "именем государства" злодеяния, кто заботится об увековечении памяти убиенных?

В Куропатах, я знаю, добрые люди ставят кресты, приносят цветы на могилы. А дикари в человеческом облике все это громят, топчут, ломают, и управы на них никакой. Святое урочище не охраняется, хотя оно — историко-культурная ценность. Спрашивать, почему такое возможно, глупо. Если верхушка государства носится, как с писаной торбой, фальшивой "Линией Сталина", потихоньку воскрешая культ "вождя всех времен и народов", будет ли она чтить память загубленных тоталитарной системой, созданной тем самым Сталиным?

Без памяти человек не человек и народ — не народ. И все, что делается якобы в его "интересах", не имеет никакого смысла...

Геннадий Иванович КОЧЕРГИН,
малолетний узник фашистских лагерей.

Витебск.

ВЕРСІІ

Высвятляйма, шукайма

Усё, што мне трапляла чытаць пра крыж Еўфрасінні Полацкай, чытаў уважліва, з зацікаўленнем і з пэўнай доляй скепсісу кожны раз. Але артыкул доктара гістарычных навук, прафесара, акадэміка Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій, паэта Мікалая Васільевіча Кузняцова "Таямніца браніраванага пакоя", змешчаны ў "ЛіМе" (№42, 17 кастрычніка 2008 г.), сваёй акцэнтацыяй на прозвішчы шырока вядомай у свой час асобы дае падставы больш канкрэтна адрасавацца да пэўных людзей і мясцін, дзе гіпатэтычна можа знаходзіцца беларуская духоўная і матэрыяльная святыня. Распавядаючы пра гісторыю стварэння крыжа, пра яго асаблівасці і каштоўнасць, яго бытаванне ў прасторы і часе і, канечне, пра знікненне перадапошнім абзацам свайго артыкула, аўтар дыялектычна працінае, прынамсі, маю істоту і пагружае яе ў светлы шок. Вядома, такое адбываецца, калі згадваем адну дэталь-акалічнасць — маскоўскую букіністычную кнігарню. Але аб гэтым — ніжэй. Бо тая дэталь-акалічнасць існуе па-за тэкстам М.Кузняцова.

А цяпер перададзім блізка да тэксту арыгінала змест названага абзаца з "Таямніцы браніраванага пакоя". Спасылаючыся на паказанні ўдзельніка баёў за Магілёў — ваеннага вадзіцеля чырвонаармейца Пятра Харытонавіча Паддубскага, М.Кузняцоў паведамляе наступнае. Па загадзе свайго камандзіра 13 ліпеня 1941 года П.Паддубскі паступіў у распараджэнне начальніка Магілёўскага гарнізона У.Ваяводзіна, які загадаў яму ехаць да абкамаўскага будынка. Па прыездзе адразу ж пачалася пагрузка маёмасці. Адзін з грузчыкаў у нейкі момант усклікнуў: "Какой крест красивый!" Пасля заканчэння пагрузкі П.Паддубскаму было загадана ехаць у банк. Машыну суправаджалі шасцёра супрацоўнікаў НКУС на чале з маёрам. Разам з імі былі яшчэ дзве машыны, таксама загружаныя там. Затым усе тры машыны рушылі ў напрамку Лупалава (ускраіна Магілёва). Там у кабіну машыны П.Паддубскага сеў першы сакратар ЦК КП(б)Б П.Панамарэнка. Рухаліся маршрутам Магілёў—Горкі—Смаленск—Мажайск—Масква. У дарозе калону з трох машын неаднаразова бамбіла фашысцкая авіяцыя. "Ценности нам надо довезти во что бы то ни стало", — паўтараў неаднаразова Панамарэнка. Праз два дні картэж дабраўся да Масквы. Машыны спыніліся каля будынка Упраўлення кадраў РСЧА. Разгрузіўшыся, чырвонаармейцы на сваіх машынах вярнуліся ў Магілёў.

Як сцвярджае М.Кузняцоў, пазней у гутарцы з паплечнікамі ў Цэнтральным штабе партызанскага руху пра духоўныя каштоўнасці беларускага народа Панамарэнка называў старадаўніх мысліцеляў, узгадваў і пра крыж Еўфрасінні.

З усяго пададзенага вышэй вынікае, што наша святыня — крыж Еўфрасінні Полацкай трапіў у 1941 годзе ў Расію, у Маскву. А ўжо канкрэтна ў чые рукі — гэта пакуль загадка.

Тут да месца колькі слоў-звестак, што не падаюцца ў савецкіх і неасавецкіх энцыклапедыях і розных даведніках такога кшталту, пра колішняга буйнейшага партыйнага боса ў Беларусі. Вядома, што Панамарэнка — зацяты і паслядоўны сталініст — адмаўляў самабытнасць беларусаў, а да іх мовы ставіўся зневажальна-грэбліва. Выслугоўваючыся перад Сталіным, ён нават пераўзыходзіў яго ў апетытах па знішчэнні беларушчыны. Ён дамагаўся ад "бацькі народаў" санкцыі на арышт і знішчэнне Янкі Купалы і Якуба Коласа. Але тыран — геніяльны злачынца — меў свае правілы гульні, прынамсі, у дадзеным выпадку. Замест ордэраў на арышт былі паднесены народным паэтам ордэны — высокія дзяржаўныя ўзнагароды, за якімі стаяла не чалавечая літасць, а д'ябальская лютасць. Я.Купалу хутка знішчылі і фізічна. Колас жа на тыя часы ацалеў, бо тыран сам праз пэўны час, як кажуць, "прыказаў доўга жыць". А калі дакладна, яму дапамаглі ў гэтым яго ж паслядоўнікі.

У інфармацыйнай прасторы сённяшняга грамадства гэта ўжо агульнае месца, аксіёма. Тут жа, у гэтай прасторы, некалькі год таму прамільгнула зусім не катэгарычнага сцвярджэння вестка аб тым, што ў Маскве ў адной з букіністычных кнігарняў выстаўляліся на продаж беларускія кніжныя рарытэты. А здаваў іх туды нехта па прозвішчы Панамарэнка (Sic!); увага на гэта звярталася вышэй у гэтым тэксце. Дык, можа, гэты нехта мае дачыненне да нашчадкаў былога першага сакратара кампартыі Беларусі? Вядома, пануючы ў Беларусі, высокі партыйны кіраўнік меў мажлівасць прыбіраць да сваіх рук рэдкія каштоўнасці — і музейныя, і асабліва тыя, што належалі рэпрэсаваным так званым "нацдэмам". Тыя каштоўнасці, зразумела, маглі перайсці да нашчадкаў былога галоўнага начальніка Беларусі. Дык, можа, і крыж святой Еўфрасінні Полацкай у іх? А калі не ў іх, дык дзе ён у Маскве, у каго?

Думайма, высвятляйма, шукайма, прымайма меры! Час рабіць захады!

Яўген ГУЧОК,
пісьменнік.

Народная Воля http://www.nv-online.info
21 ЛІСТАПАДА 2008 г.

ПОСЛЕ ВОЙНЫ

Агит Мирзоев, правозащитник из Грузии:

«Говорить напрямую с властями Абхазии и Осетии у Грузии нет возможности, необходим диалог с Россией»

Что происходит в Грузии и Южной Осетии спустя три месяца после войны? Ушли ли из зоны конфликта российские военные, вернулись ли в свои дома беженцы? Недавно в Минске с рабочим визитом побывали Агит Мирзоев и Александра Делеменчук — представители общественной организации "Общегражданское движение "Многонациональная Грузия", объединяющей 18 диаспор в Грузии. Правозащитники рассказали о ситуации в зоне недавнего вооруженного конфликта.

— В Минск приехали на белорусско-немецкий форум, так как вопросы конфликта на Кавказе и его последствий являлись темой обсуждения, — начал беседу Агит Мирзоев. — Мы выступаем за организацию и продвижение гражданского грузино-российского диалога. Эта программа, которую инициировали мы и наши коллеги из общественных организаций Беларуси, Украины и, конечно же, России. Грузино-российский диалог представляет собой прежде всего вовлечение гражданского общества в процессы переговоров и разрешение той довольно сложной ситуации, которая развивается в последнее время между грузинскими и российскими властями. Гражданский сектор — платформа, которая своим участием может внести серьезный вклад в разрешение конфликта, установление мира в регионе.

— Вы говорите о грузино-российском диалоге, но не упоминаете о грузино-осетинском и грузино-абхазском. Это не случайно?

— Сегодня нам необходимо разговаривать с российским правительством и российским обществом, наладить мост между гражданскими обществами и уже потом влиять на различные политические процессы. Говорить напрямую с администрациями Абхазии и Южной Осетии у Грузии в настоящее время нет возможности. Прежде всего потому, что, на мой взгляд, и с той и с другой стороны полностью исчерпаны те ресурсы и возможности, которые были. Я думаю, что нам необходимо говорить с Россией в присутствии стран европейского содружества, тех государств, которые могут способствовать тому, чтобы наши отношения были нормализованы.

— Грузинская сторона категорически против диалога с властями Южной Осетии и Абхазии? Предпринимал ли президент вашей страны Михаил Саакашвили попытки сесть за стол переговоров с лидерами данных самопровозглашенных республик?

— Попытки такого диалога предпринимались в прошлом, но оказались неэффективными. Стороны не были готовы к поиску компромиссных решений. Наиболее известным примером переговорного процесса была СКК — Смешанная контрольная комиссия, в состав которой входили официальные лица Грузии, России и Южной Осетии. В качестве наблюдателей в работе СКК могли принимать участие представители ООН. В течение последних нескольких лет СКК собиралась на встречи, но складывалось впечатление, что ни одна из сторон не относилась серьезно к этому механизму взаимодействия. Как раз перед началом вооруженного столкновения должно было собраться очередное заседание, но оно не состоялось по причинам, которые до конца не понятны.

На мой взгляд, правительство Грузии помимо того, что определило для себя такое направление, как диалог с Россией, должно было бы восстановить и диалог с администрациями Абхазии и Южной Осетии. Потому что если мы хотим мирно сосуществовать и восстанавливать нашу территориальную целостность, то должны делать это мирным путем. Мы не должны говорить языком агрессии и ненависти. По-моему, существенной слабой стороной официального Тбилиси является отсутствие устойчивой долгосрочной политики межэтнических отношений. Если бы Грузия смогла выработать некую политику по гармонизации этих отношений, то, безусловно, она стала бы более привлекательной для осетинской и абхазской этнических групп, потому что они имели бы определенные гарантии того, что межэтнические отношения могут регулироваться правовыми и политическими ресурсами. На мой взгляд, отсутствие такой политики в числе прочего привело к тому, что у сторон нет желания возвращаться к диалогу.

— А что сегодня происходит в Грузии, в Южной Осетии? Белорусы, к сожалению, могут судить о проблеме только по сообщениям российской прессы. А когда информация однобокая, есть опасность, что она не всегда объективна…

— Прежде всего стоит отметить, что и грузинское общество, и российское, и жители тех территорий, которые являются спорными, испытывают сегодня информационный дефицит. И российские, и грузинские информационные ресурсы проводят четкую пропагандистскую линию, которая не позволяет очень важные процессы оценивать объективно. А российско-грузинский конфликт можно решать только в многостороннем формате.

Наша правозащитная организация проводила мониторинг прессы на выявление "языка вражды и ненависти". И было зафиксировано очень много случаев, особенно в период августовского конфликта, когда представители разных государственных служб, высокопоставленные чиновники позволяли себе делать целый ряд оскорбляющих заявлений, задевая качества той или иной стороны, и это тиражировали масс-медиа. Мы публиковали списки тех грузинских СМИ, которые распространяют эту несбалансированную информацию, призывали их к ответственному поведению.

— Отсутствие объективной информации — главная проблема сегодня, или, на ваш взгляд, есть более насущные задачи, которые требуют решения?

Агит Мирзоев опасается, что по-настоящему мир в зоне грузино-осетинского конфликта наступит нескоро…

— В большей степени это, конечно, напряженность, которая по-прежнему присутствует в регионе. Если военная напряженность отчасти снята, то гражданская и политическая по-прежнему остается.

— В чем это проявляется?

— Не решена проблема беженцев. Например, для беженцев грузинского города Гори за счет грузинских властей строится жилье, разработан целый комплекс социальной поддержки, и люди имеют возможность вернуться в родной город. Однако целый ряд грузинских сел в регионе Цхинвали был уничтожен осетинскими формированиями полностью, селения стерты с лица земли, и жителям этих деревень возвращаться некуда. Сейчас власти предпринимают все возможное, чтобы расселить этих людей. Понятно, что задача эта непростая, требующая времени и ресурсов.

Александра Делеменчук: — Тут есть еще дополнительные затруднения, которые становятся понятны сейчас. В качестве примера можно привести уже построенное для беженцев жилье. Конечно, люди рады тому, что получили крышу над головой. Но прилегающие к домам территории очень малы. Переселенцы — в основном жители уничтоженных деревень, они занимались сельским хозяйством, а сейчас им выделяют четыре сотки земли, не больше. Там даже негде цветник разбить, не говоря о том, чтобы выращивать какие-то сельскохозяйственные культуры. Скажу честно, вид этих построек оставляет гнетущее впечатление. Хотя строится все очень быстрыми темпами, на это мобилизованы огромные государственные ресурсы.

— А возвращаются ли осетинские беженцы, которые в момент вооруженного конфликта оставляли свои дома в Грузии и уходили в сторону Владикавказа?

Агит Мирзоев: — Постепенно возвращаются. И на тех территориях, которые контролируются центральными грузинскими властями, этнические осетины очень мирно сосуществуют с грузинами, прекрасно общаются друг с другом. Что касается тех территорий, которые де-факто южноосетинские, то у жителей этих мест нет возможности общаться с грузинами, потому что границы закрыты.

Хотел бы отметить, что на территории Грузии проживает в два раза больше осетин, чем на территории Южной Осетии. И что касается смешанных деревень, поселков, то в районе Цхинвали, где раньше соседствовали грузинские и осетинские села, сейчас таких поселений нет. Но в других районах Грузии есть села, города, где вместе проживают грузины, осетины и представители других национальностей.

— А как грузины сейчас относятся к русским? Опасно ли россиянам сегодня приезжать в Грузию?

— Слава Богу, что несмотря на острые политические заявления официальных представителей и Грузии, и России, доброе и дружелюбное отношение к русскому народу у грузин сохранилось. Грузины до сих пор не могут понять, как такое могло произойти, ведь, в принципе, мы традиционно дружили с Россией, у нас много общего в прошлом. Даже во время самого вооруженного конфликта были зафиксированы только единичные случаи, когда грузины неадекватно реагировали на русских: один раз это проявилось в виде оскорбления, второй раз конфликт дошел до нанесения телесных повреждений. Но в любом случае эти конфликты не имели такого массового или публичного характера, как имели и имеют место в России по отношению к грузинам. Там гораздо больше зафиксировано подобных случаев, и проблема эта очень серьезная. Наши коллеги работают по мониторингу этих вопросов и отмечают, что российские организации правого толка призывают и к депортации грузин, и к прямым актам насилия против грузин. Российским правозащитникам пришлось даже обращаться в прокуратуру с заявлением о возбуждении уголовного дела в отношении одной такой организации по статье "разжигание межнациональной розни". До сих пор, правда, окончательного ответа прокуратура не дала.

— Много ли русских военных по-прежнему остается в зоне конфликта?

— Проблема, связанная с контролем над определенными территориями со стороны российских миротворческих сил, сегодня не столь актуальна, как это было во время военного конфликта. Единственное, на что я хотел бы обратить внимание: насколько справились эти так называемые миротворческие силы с теми задачами, которые перед ними ставились? Как можно объяснить тот факт, что, например, на российском блок-посту у поселка Королети не пропустили на территорию, контролируемую российскими военными, Верховного комиссара ООН по вопросам этнических меньшинств?

— Вы сказали, что грузино-абхазская и грузино-осетинская административные границы сейчас закрыты. Есть ли возможность открыть их в ближайшем будущем?

— Определенные ограничения свободного перемещения на этих территориях существовали много последних лет — это обстоятельство не нужно связывать с вооруженным столкновением в августе этого года. Весь период, пока конфликт находился в замороженном состоянии, существовал ограниченный режим передвижения, он состоял в паспортном контроле, выборочном досмотре, выборочном запрете на передвижение для отдельных лиц на административные территории Абхазии и Южной Осетии. Контрольно-пропускные пункты обеспечивались силами абхазских и южноосетинских военных.

В настоящее время, к сожалению, в регион Южной Осетии и Абхазии грузины не ездят вообще, в первую очередь из соображений безопасности. До боевых действий границы были открыты, и люди могли перемещаться с учетом паспортного контроля. Сейчас — нет. Контакты между людьми полностью прерваны. На границе стоят военные и техника, оборудованы блок-посты, которые никого не пропускают. Причем там есть и российские военные, хотя нет никаких договоренностей, которые позволяли бы им в этом формате находиться.

Александра Делеменчук: — Российские власти всегда ссылаются на миротворческие мандаты, которые уже не раз ставились под сомнение со стороны грузинского правительства и международных организаций. Не раз подчеркивалось, что не могут быть миротворческие силы представлены только одной страной, причем той, которая имеет определенные интересы в зоне конфликта. Но даже если мы пойдем по формальному принципу и будем считать эти российские силы миротворческими, то все равно в мандате четко указано, сколько конкретно людей и военной техники может находиться в зоне конфликта. И в начале осени, и сейчас количество российских военных и техники было превышено. Причем там находятся российские военные части, которые не являются миротворческими. И никто это не может проконтролировать.

Агит Мирзоев: — К слову, одним из условий известного договора Медведев—Саркози было как раз-таки присутствие в этой зоне европейских международных миротворческих сил. Но до сих пор оно не выполнено. К сожалению, по сей день мы фиксируем факты, когда некие российские службы уже даже не на территории Южной Осетии и Абхазии, а на территориях, контролируемых центральной грузинской властью, выдают российские паспорта. И потом российские власти говорят, что они защищают интересы своих граждан. Но, например, во время августовских событий мы постарались провести оценочную работу того, насколько были в безопасности граждане России, оставшиеся на тот период на территории Грузии. И то, что мы наблюдали перед зданием российского посольства и консульского отдела в Тбилиси, повергло нас в шок. Буквально всем гражданам России в устной форме от имени консула было сказано, что мы вас сюда не приглашали и не можем вам гарантировать безопасность. Мол, вы сами сюда приезжали и сами должны уезжать через Армению, Азербайджан... Также были зафиксированы случаи, когда на границе с Россией со стороны Владикавказа россияне задерживали на несколько часов своих собственных граждан, а потом запускалась информация, что этих граждан задерживали грузины...

— Существует ли опасность того, что военные действия на этих территориях могут возобновиться?

— Если мы не будем пытаться пойти по пути разрешения этого конфликта, то, безусловно, такая опасность будет сохраняться. Августовские события в Южной Осетии я рассматриваю как месэдж России не только Грузии, но и всему миру, что начинается новый этап политики. Поэтому страхи и риски в зоне грузино-осетинского конфликта остаются. Вот почему так важно начать диалог между грузинским и российским обществом.

— Выходит, до реального, а не номинального мира, той жизни, которая была, еще далеко?

— На мой взгляд, до той ситуации, которая была прежде, до вооруженного столкновения, не нужно стремиться. На ту стадию — стадию замороженного, скрытого состояния конфликта возвращаться не следует. По сути, долгие годы конфликт находился в искусственно замороженном состоянии, что привело в результате к вооруженному столкновению, гибели людей, огромному количеству трагических обстоятельств для беженцев и так далее. Многие годы отсутствовали реальные действия, направленные на создание условий устойчивого мира в регионе, и эта ответственность лежит на руководителях государств, международных организаций и межгосударственных образований, таких как СНГ, например. Сейчас мы должны стремиться к тому, чтобы выйти на новый этап, предусматривающий некую другую линию, и говорить о глобальном разрешении ситуации. Нужно пытаться искать пути разрешения концептуального характера. Сколько для этого понадобится времени, сказать сложно. К сожалению, я думаю, что могут уйти десятки лет, должна произойти смена поколений... Но при этом мы должны сотрудничать и пытаться говорить друг с другом уже сегодня, как бы трудно это ни было...

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Сейм Литвы выбрал председателя со второй попытки

Сейм Литвы со второго раза выбрал председателя, которым стал лидер Партии народного возрождения (ПНВ) Арунас Валинскас, сообщает агентство "Интерфакс" со ссылкой на пресс-службу парламента Литвы.

Первая попытка избрать спикера, предпринятая ранее, закончилась неудачно, так как против кандидатуры Валинскаса проголосовали 69 депутатов, а за — лишь 67. После этого в заседании был объявлен перерыв, во время которого правящая коалиция, выдвинувшая Валинскаса, сумела собрать 80 подписей депутатов в его поддержку.

Таким образом, в ходе второго голосования, состоявшегося через несколько часов после первого, симпатии депутатов распределились по-другому — за Валинскаса проголосовали уже 78 парламентариев (из 141), обеспечив ему пост спикера парламента.

Представители оппозиции сочли повторное голосование незаконным, так как во время первого не было зафиксировано никаких нарушений. В связи с этим оппозиция намеревается обратиться в Конституционный суд, который должен будет проверить состоявшееся голосование на предмет соответствия основному закону.

Джорджа Буша-старшего освистали студенты в Канзасе

Джорджа Буша-старшего освистали студенты в Университете Канзаса, передает телеканал KSHB-TV. Экс-президент выступал перед университетской аудиторией по случаю вручения ему Премии Роберта Доула за достижения в службе государству.

Перед получением награды Буш отвечал на вопросы ведущего, а также студентов, которым присуждена стипендия Роберта Доула за успехи в общественной работе. В частности, экс-президент рассказал, какой совет он мог бы дать Бараку Обаме — победителю недавних президентских выборов.

"Мой совет был бы таков, — сказал Буш. — Делайте, что считаете нужным, и пытайтесь убедить американский народ в своей правоте. Если с каким-то законопроектом вы попадаете в тупик, измените курс и продолжайте игру". Это одна из ремарок бывшего главы государства, вызвавших крики в аудитории. Всего выступление Буша прерывали три раза, охране пришлось вывести из зала шестерых нарушителей порядка.

В общей сложности на выступление Буша пришли около 2 тысяч зрителей. Премия, носящая имя Роберта (Боба) Доула, бывшего сенатора-республиканца и кандидата в президенты, вручается в Университете Канзаса ежегодно. Фонд премии составляет 25 тысяч долларов.

В Эстонии подсчитают ущерб от российского шпиона

Министерство обороны Эстонии дало предварительную оценку ущербу, который был нанесен стране в связи со шпионской деятельностью высокопоставленного сотрудника военного ведомства Хермана Симма. Об этом сообщает "Интерфакс" со ссылкой на Eesti Paevaleht.

По словам министра обороны Яака Аавиксоо, ущерб может составить до ста миллионов крон (около восьми миллионов долларов). Чиновник сообщил, что сумма уточняется, отметив при этом, что она "наверняка больше миллиона крон" (восьмидесяти тысяч долларов).

Напомним, что Херман Симм в середине 1990-х годов руководил отделом по защите государственных тайн в эстонском Министерстве обороны. Он создавал в республике систему охраны секретной информации, необходимую Эстонии для вступления в НАТО. Через Симма, как сообщали СМИ, проходила вся информация по Североатлантическому альянсу, поступавшая в страну.

Официальной информации о том, какие конкретно секреты выдал Симм российской разведке (в сотрудничестве с которой он признался после ареста), не поступало.

В СМИ высказывались предположения, что он мог передать России данные, касающиеся киберзащиты НАТО и американской ПРО. Однако министр обороны Эстонии назвал эти версии "спекуляциями". В Эстонию, как сообщалось, были направлены специальные группы из ЕС и НАТО, которым поручено провести расследование в связи со "шпионским скандалом".

Херман Симм, напомним, был задержан в конце сентября. На допросах он признался, что сотрудничал с российской Службой внешней разведки, а ранее — с Комитетом госбезопасности СССР.

Рыбная валюта

Американские заключенные используют в качестве внутритюремной "валюты" рыбу, пишет The Wall Street Journal. После того как в 2004 году в тюрьмах США ввели запрет на курение, своеобразным "золотым стандартом" при расчетах вместо сигаретных пачек стали консервы из макрели.

По словам Марка Бейли, который отбывает двухлетний срок в одной из тюрем Калифорнии, макрелью заключенные "оплачивают" глажку белья, чистку обуви или стрижку. К примеру, стрижка стоит две банки.

НЕЗВЫЧАЙНАЯ ТЭМА

Ці з'явіцца на Беларусі самы вялікі музычны інструмент?

Ці ведаеце вы, што радзіма "малінавага звону"... Бельгія, а не Расія, як хтосьці мог падумаць?

На поўначы Бельгіі месціцца старажытны фламандскі горад Мехелен. Ужо з XVII стагоддзя гэта — еўрапейскі цэнтр музыкі царкоўных званоў, якім з'яўляецца і да гэтай пары. У 1717 годзе Мехелен наведаў расійскі цар Пётр І. Менавіта тут ён упершыню пачуў карыльён, у склад якога уваходзяць ад 20 да 60 званоў розных памераў. Гук карыльёна, віртуозная гульня мясцовых карыльёністаў уразілі манарха.

Дырэктар Каралеўскай школы карыльёна Бельгіі Йо Хаазэн расказвае на добрай рускай мове: *"Ему настолько понравилось, что он сказал, что мне тоже хочется такие инструменты в России. И он купил три карильона для города Санкт-Петербурга, и два карильона — для Москвы".*

Пятру спадабаўся не толькі дзіўны музычны інструмент, але і французская назва горада Мехелена, у якім ён яго ўпершыню пачуў, — Малін *(націск на апошнім складзе).* Менавіта з лёгкай рукі цара, як сцвярджае дырэктар Каралеўскай школы карыльёна Бельгіі Йо Хаазэн, у расійскай мове і з'явіўся тэрмін "малінавы звон". Сам Йо грае "малінавы звон" з натхненнем і знешняй лёгкасцю, хаця, відавочна, што гэта майстэрства — не для слабакоў.

"Карильон весит сорок тонн. Мы играем кулаками и ногами. Это значит не как на фортепиано, мы работаем по-другому", — распавядае Йо.

У школе карыльёна, якой кіруе бельгійскі музыка, навучаюцца студэнты з 14 краін свету. Беларускіх студэнтаў там пакуль што няма, але з нашай краінай Йо Хаазэна нешта звязвае.

"У меня в Минске несколько друзей, — кажа музыка. — *Между прочим, Татьяна Асташ из Минска, которая написала музыку для карильона. Так что даже ваши музыканты как-нибудь связаны с этим искусством. И друзья хотели сделать, построить карильон в Минске, но до сих пор ничего не получилось".*

Прычыны, як заўсёды, фінансавыя. Карыльён — інструмент не самы танны. Але надзеі прафесар не губляе.

"Так что в будущем, может, будет карильон и в Минске, Бог знает... — мяркуе Йо. — *Чтобы реализовать карильон в Санкт-Петербурге, нам надо было искать 350 спонсоров. Это много. Это был огромный проект, мы работали над этим проектом 12 лет. Потому что карильоны — это самые большие инструменты в мире. Это тяжелые инструменты и вообще дорого стоят".*

Каб недахоп карыльёна ў Мінску неяк згладзіць, прафесар Хаазэн ідзе на "радыкальныя меры": з вышыні 120 метраў, з даху мехеленскага сабора Святога Рамбаўта, пераадолеўшы 515 ступенек, на 49 званах эксклюзіўна для беларускага журналіста ён прэзентуе сапраўдны "карыльён дэ Малін" (carillon de Malines) — малінавы звон... Шкада, што чытачы "Народнай волі" не могуць пачуць гэты чароўны гук...

Наталля ГАК.

Бельгія.



Народная Воля http://www.nv-online.info
21 ЛІСТАПАДА 2008 г.

ТРЫВОЖНА!

Рэха Чарнобыля на нашых сталах

Перавышэнне дапушчальных узроўняў радыенуклідаў зарэгістравана ў прадуктах харчавання, што вырабляліся ў асабістых падсобных гаспадарках Брэсцкай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей. Пра гэта паведамляе Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.

На працягу першага паўгоддзя 2008 года падраздзяленні радыяцыйнага кантролю санслужбы правялі даследаванне 38.863 проб харчовых прадуктаў з вытворчага сектара і асабістых падсобных гаспадарак на ўтрыманне ў іх радыенуклідаў, у тым ліку 1346 — на ўтрыманне стронцыю-90. У харчовых прадуктах з вытворчага сектара не выяўлена перавышэння дапушчальнага ўтрымання цэзію-137 і стронцыю-90, а вось у прыватных гаспадарках сітуацыя трывожная..

У першым паўгоддзі 2008 года ў названых абласцях зарэгістраваны 53 населеныя пункты, у якіх малако не адпавядала патрабаванням экалагічнай бяспекі прадуктаў харчавання па ўтрыманні цэзію-137. Такіх населеных пунктаў у Брэсцкай вобласці было 13, у Гомельскай — 39, у Магілёўскай — адзін.

Перавышэнне дапушчальнага ўтрымання стронцыю-90 было зарэгістравана ў малацэ з асабістых падсобных гаспадарак у 20 населеных пунктах Гомельскай вобласці (Брагінскі, Нараўлянскі, Хойніцкі раёны). Паводле інфармацыі санслужбы, "прычынамі, якія абумовілі перавышэнне РДУ-99 па ўтрыманні стронцыю-90 у малацэ, з'яўляюцца выкарыстанне кармоў з перавышаным утрыманнем стронцыю-90, выпас жывёлы на натуральных пашах, непрыдатных землях, у лясных масівах, а таксама ўмовы надвор'я".

Зарэгістраваныя выпадкі заражэння радыенуклідамі, у прыватнасці цэзіем-137, грыбоў (Брэсцкая, Гомельская, Магілёўская, Мінская і Гродзенская вобласці); дзікарослых ягад (Брэсцкая, Гомельская, Магілёўская і Мінская вобласці); рыбы (Гомельская вобласць), лекавай сыравіны (Гомельская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская вобласці), агародніны (Магілёўская вобласць), мяса дзікіх жывёл (Гомельская, Магілёўская, Мінская вобласці).

Алена СПАСЮК.

СІТУАЦЫЯ

Расія лічыць беларускія прадукты небяспечнымі. Але мы іх ядзім...

Сістэма кантролю якасці прадукцыі жывёльнага паходжання ў Беларусі не можа гарантаваць бяспеку прадуктаў, што пастаўляюцца ў Расію.

Такая выснова ўтрымліваецца ў паведамленні сельгаснагляду Расіі, які быў распаўсюджаны па выніках кастрычніцкага візіту ў Беларусь экспертаў гэтага ведамства. Як паведамляе "РИА "Новости", эксперты азнаёміліся з сістэмай лабараторнага маніторынгу прадукцыі, што пастаўляецца ў Расію.

Як зазначаецца ў прэс-рэлізе, камісія Рассельгаснагляду прыйшла да наступнага заключэння: *"Выяўленыя сістэмныя недахопы ў арганізацыі дзяржаўнага кантролю рэшткавых колькасцяў шкодных рэчываў у арганізме жывых жывёл і прадуктаў жывёльнага паходжання ў Беларусі сведчаць пра недастатковую эфектыўнасць і дакладнасць праводзімых даследаванняў".* На думку экспертаў Рассельгаснагляду, адпаведныя службы Беларусі *"не змогуць аператыўна і адэкватна адрэагаваць у выпадку выяўлення прадукцыі, якая не адпавядае патрабаванням бяспекі".*

Як паведамлялася раней, Рассельгаснагляд аб'явіў пра забарону з 1 лістапада ўвозу ў Расію малочнай прадукцыі і мяса птушкі 20 беларускіх прадпрыемстваў. Пазней па дамоўленасці бакоў гэты тэрмін быў перанесены на 1 снежня, нагадвае БелаПАН.

Беларусаў жа больш цікавіць, ці бяспечныя тыя прадукты, якія трапляюць на нашы прылаўкі. Зразумела, што афіцыйныя асобы запэўніваюць, што абсалютна бяспечныя. Але ў сувязі з высновамі расійскіх санэпідэмслужб у гэтым можна засумнявацца.

РАССЛЕДОВАНИЕ

Загадка Михаила Коломийца

Шесть лет назад в Беларуси таинственно погиб известный украинский журналист

То, что Беларусь давно уже стала зоной, опасной для работы журналистов, — ни для кого не секрет. Но обычно все же пропадали без вести или подвергались репрессиям белорусские журналисты. Однако шесть лет назад произошла совершенно таинственная история, связанная со смертью в Беларуси одного из ведущих украинских журналистов. В лесу в окрестностях Молодечно был найден повешенным директор крупнейшего украинского информационного агентства "Украинские новости" Михаил Коломиец. И по сей день никто не может толком сказать, что же тогда произошло.

Официальная версия

Наверное, самое лучшее — сразу напомнить "внешнюю" суть произошедшего. Вот что рассказывал тогда прокурор Молодечненской межрайонной прокуратуры Геннадий Збигневич Вешторт: *"30 октября 2002 года в 15 часов 40 минут в Радошковичское отделение милиции Молодечненского РОВД поступило сообщение об обнаружении трупа неизвестного мужчины, покончившего жизнь самоубийством через повешение в петле в лесном массиве [...] около деревни Вязынка. Из заключения судебно-медицинского эксперта следует, что смерть неустановленного мужчины наступила вследствие сдавления органов шеи петлей при повешении. Признаков насилия либо признаков причастия других лиц к смерти повешенного мужчины в процессе судебно-медицинской экспертизы, в процессе прокурорской проверки не установлено.*

С учетом изложенного, 16 ноября сотрудниками межрайонной прокуратуры в возбуждении уголовного дела по факту смерти неизвестного мужчины было отказано. 14 ноября он был захоронен на кладбище вблизи города Молодечно как неизвестный.

18 ноября 2002 года от представителей Министерства внутренних дел Украины, сотрудников МВД Республики Беларусь в прокуратуру поступило сообщение о том, что неизвестный мог быть гражданином Украины — Коломиец Михаил Петрович, 1958 года рождения, который был прописан в городе Киеве. Работал директором информационного агентства "Украинские новости". Поэтому 19 ноября 2002 года постановление об отказе в возбуждении уголовного дела по данному факту было отменено и возобновлена проверка.

20 ноября в связи с обращением Министерства внутренних дел Республики Беларусь, которое появилось в связи с просьбой представителей Министерства внутренних дел Украины, а также в связи с заявлением родственников, была произведена эксгумация трупа и повторная судебно-медицинская экспертиза. В этот же день прибывшими в Молодечно родственниками Коломийца было проведено опознание его одежды и фотографий неизвестного мужчины. При опознании родственники убедительно высказались о том, что неизвестный мужчина является именно Михаилом Петровичем Коломийцем. При опознании трупа это мнение было подтверждено. Опознание производилось матерью умершего и его гражданской женой в последнее время.

Повторное судебно-медицинское исследование трупа, которое проводилось комиссионно, подтвердило выводы предыдущей судебно-медицинской экспертизы. В настоящее время по материалу проводится дополнительная проверка, в процессе которой необходимо выяснить следующие вопросы: причины нахождения гражданина Михаила Петровича Коломийца в Республике Беларусь и конкретно городе Молодечно; установление конкретных лиц, с которыми он мог общаться; будет проводиться работа по установлению возможного местонахождения его вещей, поскольку с 25 по 28 октября он проживал в гостинице города Молодечно, и при нем были некоторые вещи, в том числе мобильный телефон. На месте обнаружения трупа личные вещи и документы найдены не были.

В тот же день, когда были проведены эксгумация, опознание и повторная экспертиза, труп был передан родственникам для перевозки его в Украину, к месту окончательного захоронения.

Я беседовал с матерью умершего и должен сказать, что это достаточно мужественная женщина, которая стойко перенесла произошедшее. Она охарактеризовала своего сына как достаточно мужественного, уверенного в себе человека, который мог, умел, знал, как достигать поставленные перед собой цели. Для нее тоже остаются загадкой причины его пребывания на территории Республики Беларусь, возможные контакты здесь. Пока она теряется в догадках. Но и она высказывает мнение, что если мы найдем причину его приезда сюда, в Молодечно, и вообще в Республику Беларусь, то найдем и мотивы, побудившие его поступить именно так. И еще: по результатам экспертизы алкоголя в крови умершего обнаружено не было, то есть на момент смерти Коломиец был совершенно трезв".

Кроме того, прокурор признался, что совершенно не верит в версию самоубийства Коломийца и, на его взгляд, все свидетельствует о работе спецслужб. Правда, не совсем понятно, каких именно и какой страны. Подобные высказывания, да еще и при включенном диктофоне, часто губительны для белорусского чиновника любого уровня. Ведь Генпрокуратура Беларуси на тот момент уже официально заявила, что имело место обычное *"простое"* самоубийство. То есть молодечненский прокурор попросту опроверг собственное (и самое высокое) начальство. Обычно такое не прощают...

Частное расследование

Я съездил в гостиницу, в которой провел свои последние дни Коломиец, побеседовал с ее сотрудниками. Все они говорили, что постоялец заметно нервничал, а порою вообще находился на грани истерики. И все время чего-то (или кого-то) ждал. Я также сделал копию гостиничной карточки Коломийца. И обнаружил интересный факт: заселившись в гостиницу 25 октября, Коломиец оплатил только один день проживания, и в дальнейшем также оплачивал каждые сутки проживания по отдельности — до 28 числа. Чего он ждал?

До сих пор во всей этой истории больше вопросов, чем ответов. Главное — поведение погибшего. Все же весьма небанально — бросить успешный бизнес и приехать в другую страну, чтобы там свести счеты с жизнью. Можно было бы еще как-то понять, если бы Коломиец просто приехал в Минск и повесился. Но что его понесло в Молодечно — совсем уж непонятно. Далее. Почему работники гостиницы не сообщили в милицию о странном поведении иностранного постояльца? У них-то имелись его документы. Тогда не было бы и похорон *"неопознанного трупа"*. И как его киевские родственники все же вышли на след, если, по их же утверждению, Коломиец из Молодечно им не звонил? И еще. Где его вещи и документы? Ладно бы, кто-то ограбил повешенного (само по себе маловероятно, учитывая суеверность жителей белорусской глубинки), но этот "кто-то" вряд ли бы стал забирать документы.

Киевские версии

Ясно одно: Коломийца из Киева что-то гнало. Вот только что? И почему по маршруту Киев—Минск—Молодечно? Да, политический кризис тех месяцев, повлекший отставку украинского правительства, вполне мог прямо или косвенно быть связан с деятельностью (и гибелью) Коломийца. А белорусские спецслужбы просто помогли своим украинским коллегам. Правда, как было официально объявлено милицией, *"следов насильственной смерти на теле не обнаружено"*. Но понятно, что если такое дело проворачивают спецслужбы, то милиции там уже делать нечего. Впрочем, не исключена и криминальная версия...

Так или иначе, по цепочке произошедших событий видно, что Коломийца скорее всего попросту заманили — сначала в Минск, затем в Молодечно. А потом что-то произошло, и журналист оказался в лесу с петлей на шее. А сам ли он в нее влез, или ему помогли — дело другое. Коломиец оказался опасен для кого-то в Киеве. Директор информационного агентства — не последняя личность в любой стране.

Я связался со своими киевскими коллегами. Выяснилось, в Киеве не сомневаются, что самоубийство было инсценировано. Киевляне дают свою хронологию событий. Последний раз главный редактор и директор агентства "Украинские новости" Михаил Коломиец показался на работе в понедельник, 21 октября. По словам шеф-корреспондента агентства Егора Соболева, в обычном режиме отработал первую половину дня — звонки, совещания — и в обед уехал на какую-то встречу. Во второй половине дня заехал в редакцию только на десять минут, никому ничего не сказал, все время находился у себя в кабинете, перебирал какие-то бумаги и спешно уехал, опять же, никому не сообщив куда именно. Позже журналисты и милиция обнаружат, что он взял с собой свою телефонную книжку и перед уходом *"вычистил"* файлы на личном компьютере. А среди оставшихся бумаг не обнаружили ничего, что бы могло указывать на какие-то угрозы.

Уже к вечеру ему никто не мог дозвониться на мобильный. Хотя звонили чуть ли не все сотрудники. Со вторника, 22 октября, мобильный телефон Коломийца уже *"мертв"*. Далее, по версии милиции, в половине пятого вечера во вторник Коломиец вызывает к своему дому такси, уезжает на вокзал, покупает билет и садится в поезд Киев—Минск (его опознала проводница). Сойдя с поезда 23-го утром, он на четыре дня исчезает в Минске (не установлено ни где он жил, ни с кем встречался). 28-го в 17.00 он в последний раз звонит со своего старого мобильного телефона на номер своей подруги Любови Рубан.

По версии милиции, начиная с момента исчезновения, Коломиец звонил только трем людям: Егору Соболеву, матери и по вышеуказанному номеру. Но, как следует из распечатки его переговоров, он разговаривал еще с четырьмя абонентами. Кто они — неизвестно.

Сами сотрудники "Украинских новостей" уверены, что произошедшее с их шефом никак не было "побегом от трудностей". Во-первых, коммерческие дела в агентстве шли вполне хорошо, оно приносило устойчивую прибыль. Во-вторых, Коломиец — не тот человек, который станет пасовать перед трудностями. За десять лет до гибели он создал "с нуля" информационное агентство и вывел его в лидеры в сложнейших условиях перестроечной Украины. Самоубийство — не для таких, как он.

Политическая версия гибели журналиста более вероятна. Хотя Михаила Коломийца в последние годы жизни нельзя было назвать оппозиционным журналистом. Он не писал статей, не подписывал петиций. Он знал, что делал, когда почти задаром отдавал половину акций своего агентства одному из наиболее близких и лояльных к президенту Кучме политиков. Он искал и нашел *"крышу"* у власти, а не у оппозиции. Тем не менее "Украинские новости" делали в современных украинских условиях, наверное, максимум из возможного. Давали новости с двумя точками зрения на происходящее. Корректно, без лишнего ерничанья приводили цитаты Кучмы. Но так же полно цитировали и ответы представителей оппозиции, в то время как большинство других украинских медиа их замалчивали. И неизменно на 10—15% превышали негласную, неписаную *"допустимую степень наглости"* в освещении острых политических тем: Мельниченко, "Кольчуги", НАТО. Таким же образом в свое время вел себя и Гонгадзе. А Коломиец как раз предельно активно участвовал в скандале вокруг поставок "Кольчуг" в Ирак...

Психологи утверждают, что ни один человек на планете в клинической практике последних двухсот лет не накладывал на себя руки, если не приводил свой приговор в исполнение в течение двух часов после объявления об этом окружающим. А Коломиец якобы обсуждал это по телефону через неделю после исчезновения. Кстати, *"о намерении совершить суицид"* он сказал только одному из семи человек, с которыми говорил по телефону после того как покинул Киев.

И даже начальник Уголовного розыска Украины, созвавший по этому поводу пресс-конференцию, не выдержал и, анализируя сумму фактов и обстоятельств, в конце обронил: *"Вообще-то так с собой не кончают". — "Но это мое личное мнение, ни в коем случае не мнение Министерства внутренних дел"*, — поспешно добавил он. И действительно, зачем человеку, решившему уйти из жизни по причинам, никак не связанным с его работой, предварительно вытирать все файлы со своего компьютера и прятать от всех свою телефонную книгу так, что ее до сих пор никто не может найти.

Опасный комментарий

А теперь — комментарий, возможно, проливающий свет на многое. Свое понимание описанных выше событий автору этих строк анонимно высказал его давний источник в одной из белорусских спецслужб. Привожу практически дословно: *"Конечно же, тут наши (*спецслужбы. — **Авт.***) помогли украинским коллегам. Они постоянно друг другу помогали. Во-первых, все-таки, соседи; а во-вторых — обе скомпрометированы в глазах и Запада, и Москвы. Вот недавно Беларусь Украине с "Кольчугами" помогла. Хохлы продали Ираку несколько своих установок, а когда разразился скандал, к ним направили из НАТО специальных проверяющих, чтобы те посчитали — все ли на месте "Кольчуги", оставшиеся в Украине после распада СССР. Так из Беларуси был отправлен тогда в Украину эшелон с недостающими установками — "одолжили", так сказать... То же и с Коломийцем. В Украине своим силовикам уже не доверяли, вот и попросили соседей помочь. Да и тот же "черный" экспорт калийной соли... Ее за рубеж традиционно морем вывозят — так вот Украина и порты для этого предоставляла, и железные дороги для транзита. И все это нигде Украиной никак не учитывалось. Так теневой бюджет и формируется..."*

Вряд ли стоит принимать эти слова за чистую монету. Но как одну из версий, думаю, можно рассматривать.

Виктор ДЕМИДОВ.

БЫЛО!

Помста

У вёсцы Лужкі адным з першых запісаўся ў калгас Змітрок Крывулька, стаў яго актыўным арганізатарам. Сябе ён лічыў бедняком, хоць меў ладны надзел не горшай зямлі, трымаў каня, пару кароў, але не любіў гаспадарыць, як ягоныя два суседы праз вуліцу. Тых неўзабаве, калі па вёсках пачаліся пошукі "кулакоў", не без ягонай, Змітраковай падказкі, унеслі ў спіс на высяленне за Котлас. А Змітрака праўленне створанага калгаса прызначыла лесніком.

Абход у яго быў за вёскай, мо гектараў шэсцьдзесят лесу. Раніцай ён закідваў за плячо сваю стрэльбу і крочыў на "службу", за што яму налічвалі нейкі працадзень з чвэрцю. Брыгадзір пабойваўся ўключыць яго, як іншых вясковых мужчын, у нарад на сенажаць, на звозку снапоў з поля ў час жніва, бо ведаў, што Змітрок ужо быў завербаваны спецслужбамі на ролю іхняга інфарматара.

Як засведчыў нядаўна тэлеканал "РТР-Планета" ў перадачы пра былога члена Палітбюро ЦК КПСС Анастаса Мікаяна, ён, выступаючы з дакладам на 20-гадовым юбілеі ВЧК—ГПУ—НКВД, заявіў: "Каждый гражданин СССР — сотрудник НКВД". У Лужках быў адзін такі на ўсю вёску. Таму мужчыны звычайна баяліся ўступаць з ім у размовы пры сустрэчы, на брыгадных сходах, калі Змітрок там прысутнічаў, слухаліся парады жонак: "Лішняга не балбачы пры Крывульку, а то ўбачыш неба ў клетачку".

І ўсё ж Змітрок меў пэўную інфармацыю аб настроях вяскоўцаў і дакладваў, куды яго прасілі. Ва ўсякім разе ў 1937 годзе, калі за дзве ночы з Лужкоў "чорны воран" забраў трох дарослых мужчын, то вяскоўцы ў сем'ях цішком гаварылі, што гэта Змітрок прыклаў руку да іх арышту і высылкі.

У 1941 годзе на чацвёрты дзень вайны, калі бежанцы і адступаўшыя салдаты сталі гаварыць, што немцы падыходзяць да Слуцка, Змітрок знік з вёскі, пакінуўшы жонку з двума дзецьмі. Але праз месяц няголены, схуднелы вярнуўся ў вёску. На пытанне ўжо пасмялеўшых мужчын, чаму ён не пайшоў за адступаючымі салдатам, маўляў, яшчэ не зломак, мог бы і паслужыць радзіме, Змітрок адказаў: "За Бабруйскам мяне дагналі нямецкія танкі, перакрылі дарогу на ўсход". Яму верылі і не верылі — болей гаварылі, што збаяўся фронту і рашыў за лепшае адсядзецца дома, у цёплай хаце. Хоць не мог не здагадацца, што камусьці са сваякоў раскулачаных землякоў ягонае даваеннае мінулае не дасць спакою. Нехта данёс на яго ў слуцкую паліцыю, зімой 1942 года ў вёску адтуль прыехалі трое ў чорных шынялях з вінтоўкамі, Змітрака арыштавалі як інфарматара спецслужбаў, збілі, кінулі ў сані і паехалі назад. Праз некалькі дзён жонка Крывулькі хадзіла ў горад і ад знаёмага паліцая, ураджэнца суседняй вёскі, даведалася, што мужа яе расстралялі. Яе і дзяцей не чапалі, так удавой пражыла і век свой.

Алесь КАРНІЦКІ,
жыхар г.Слуцка.

P.S. *З этычных меркаванняў імя і прозвішча лесніка зменены.*

На Гродзеншчыне створаны штаб для пераадолення крызісу

Для аператыўнага вырашэння пытанняў працы прадпрыемстваў Гродзеншчыны ва ўмовах сусветнага фінансавага крызысу ў аблвыканкаме створаны адмысловы штаб, мэтай якога з'яўляецца каардынацыя дзеянняў у выпадку, калі будзе пагаршацца фінансавае становішча прамысловасці.

Кіраўніцтва Гродзенскага аблвыканкама прызнае той факт, што наступствы сусветнага фінансавага крызісу адбіваюцца на працы прамысловасці рэгіёна. У сувязі з гэтым узмоцнены кантроль на ўсіх прадпрыемствах вобласці: інфармацыя аб фінансава-эканамічным становішчы штодзённа накіроўваецца ў адмыслова створаны штаб, які павінен прымаць захады аператыўнага рэагавання.

Кіраўнікі прадпрыемстваў атрымалі загад старшыні аблвыканкама, паводле якога нясуць персанальную адказнасць за становішча на прадпрыемствах - - не толькі фінансавае, але і сацыяльна-палітычнае: у выпадку страйкаў і іншых акцый пратэсту ім пагражае крымінальная адказнасць.

На заводах і фабрыках Гродзеншчыны загадам зверху забараняецца паніжаць памеры заробкаў і аб'ёмы вытворчасці. Дзеля падтрымкі стабільнасці ў рэгіёне створаны адмысловы фонд, з якога будуць фінансавацца тыя прадпрыемствы, якія знаходзяцца ў найбольш занядбаным стане.

Мінскія юрысты акажуць бясплатную прававую дапамогу жыхарам горада

Напярэдадні Дня юрыста, які сёлета адзначаецца 7 снежня, мінчане змогуць бясплатна атрымаць прававую дапамогу. Пра гэта паведамілі ў галоўным упраўленні юстыцыі Мінгарвыканкама.

У межах акцыі "Сіла права" 19 і 26 лістапада жыхары сталіцы змогуць атрымаць бясплатную прафесійную прававую дапамогу спецыялістаў усіх дзяржаўных натарыяльных кантор. Можна будзе пракансультавацца па пытаннях адчужэння нерухомасці, афармлення спадчынных правоў, сведчання тэстаментаў, шлюбнага дагавору, даверанасцяў і іншых. Бясплатную кансультацыю па пытаннях рэгістрацыі шлюбу і нараджэння можна будзе атрымаць у аддзелах органаў ЗАГС, паведамляе БелаПАН. З снежня мінчукі змогуць звярнуцца ў галоўнае ўпраўленне юстыцыі Мінгарвыканкама па пытаннях абслугоўвання і арганізацыі працы раённых судоў, дзяржаўных натарыяльных кантор і прыватных натарыусаў, органаў ЗАГС, юрыдычных кансультацый. Тут таксама можна будзе атрымаць тлумачэнні заканадаўства па пытаннях рыэлтарскай дзейнасці, ліцэнзійных патрабаванняў і ўмоў, якія павінны выконвацца асобамі, што маюць ліцэнзіі на аказанне юрыдычных паслуг.

Адвакаты юрыдычных кансультацый Мінска 5 снежня будуць тлумачыць дзейнае заканадаўства ў галіне працоўнага, грамадзянскага, сямейнага і жыллёвага права. Яны бясплатна пракансультуюць маламаёмасных грамадзян: шматдзетных і адзінокіх маці, пенсіянераў і асоб, якія маюць права на льготы.

Народная Воля http://www.nv-online.info
21 ЛІСТАПАДА 2008 г.

РЭГІЁН

Музей у Гальшанах больш не працуе

У вёсцы Гальшаны Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці закрываецца філіял Нацыянальнага мастацкага музея "Архітэктурны комплекс XVI—XVIII стагоддзяў у Гальшанах", паведаміла малодшы навуковы супрацоўнік установы Тамара Жызнеўская.

З жніўня 1989 года філіял музея размяшчаўся ў будынку кляштара францысканцаў — помніка архітэктуры барока XVI—XVIII стагоддзяў, які знаходзіцца ў аварыйным стане. Будынак кляштара плануецца паставіць на кансервацыю, а затым перадаць мясцовай рымска-каталіцкай абшчыне святога Яна Хрысціцеля. Варта зазначыць, што кляштар складае адзіны архітэктурны ансамбль з Гальшанскім касцёлам.

"Сёння філіял музея пакідае апошняя экспазіцыя — выстава жывапісу мясцовых мастакоў Сцяпана Аўсюкевіча і Мар'яна Козыра, выпускнікоў Мірскага вучылішча рэстаўратараў у Карэліцкім раёне Гродзенскай вобласці. Матэрыялы археалагічных даследаванняў Гальшан, якія знаходзіліся ў фондах нашай установы, мы перадаём Ашмянскаму краязнаўчаму музею", — сказала Т.Жызнеўская.

Гісторыя вёскі, якая ў XIV—XV стагоддзях з'яўлялася горадам, цэнтрам Гальшанскага княства, гандлю і рамёстваў, заўсёды прыцягвала ў Гальшаны шматлікіх турыстаў, што прыязджалі паглядзець не толькі на руіны мясцовага замка Сапегаў, помніка палацава-паркавай архітэктуры XVI—XVII стагоддзяў, ансамбль касцёла і кляштара францысканцаў, але і азнаёміцца з экспазіцыяй філіяла музея НММ.

"З аднаго боку, мы перажываем, што філіял зачыняецца, бо за 19 гадоў дзейнасці распрацавана тэматыка экскурсій па Гальшанах, у нас з'явіўся свой кантынгент наведвальнікаў. З іншага боку, будынак кляштара неабходна тэрмінова рэстаўраваць, каб прадухіліць яго разбурэнне. Разам з тым мы спадзяёмся, што пасля аднаўлення будынка наша ўстанова адродзіцца", — сказала Т.Жызнеўская.

Марат ГАРАВЫ.

Вельмі цёплай, сардэчнай атрымалася сустрэча нашага знанага паэта Генадзя Бураўкіна з чытачамі на сядзібе ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны". Генадзь Мікалаевіч распавядаў пра сваіх таварышаў па пяры — бліскучых майстроў прыгожага пісьменства рознага веку, адказваў на пытанні. І, канечне ж, чытаў свае новыя вершы. Трэба думаць, што аматарам сапраўднай паэзіі будзе цікава пазнаёміцца хаця б з часцінкай багатага плёну, створанага Генадзем Бураўкіным за апошні час.

Генадзь БУРАЎКІН

З новых вершаў

***

Зайздроснікі і злоснікі зазвычай
Мяне і папракалі,
І клялі
За шчырасць
І характар ваяўнічы
І боль ад крыўдаў матчынай зямлі.

Хаця мяне і ведалі даволі,
Ніяк даўмецца не маглі яны,
Чаму нікому я не ўмеў дазволіць
Нахабства,
Падхалімства
І маны.

З такім запалам мне пад дых лупілі,
Аж да крыві збівалі кулакі,
І спадцішка бязлітасна ляпілі
Ганебныя,
Дурныя ярлыкі.

А я шукаў
Разважлівасць і згоду,
Прыцішваў свой неўтаймаваны гнеў
І спакайнеў,
Здаецца,
Год ад году,
І да абвінаваўцаў лагаднеў.

Я марыў жыць
Сумленнай талакою,
Не раздзімаць варожасці агні.
Я так хацеў
Даверу і спакою.
Ды ўслед мне
Зноў кідаюць камяні.

І калі ўрэшце на сцяжынцы вузкай
Адчую і пачую я: "Пара!",
Я адыду
З усмешкаю на вуснах,
Усім
Як ёсць
Жадаючы дабра...

***

Гэта ж трэба —
Не звяліся
Дэмагогі-дабрадзеі,
Што на нас з суседскіх высяў
Непаважліва глядзелі.

І цяпер буркочуць злосна
І падсмейваюцца хітра:
-- Што ў вас там?
Балоты,
Сосны,
Журавіны
Ды ракіты.
Што ў вас ёсць.
Апроч пакоры?
Хіба вы свой лёс вяршылі?
Дзе ў вас стэпы?
Дзе ў вас моры?
Дзе ў вас горныя вяршыні?
Вы ж ужо ад мовы роднай
Адмаўляецеся самі
І сягоння нават згодны
Называцца бульбашамі...

І глядзяць з такой пагардай,
З гэткім выклікам,
Няйначай,
Што як быццам нам і праўда
Адказаць зусім няма чым.
Ох, панове дабрадзеі!
Як бы вы хацелі лоўка
Адабраць у нас надзеі
І загнаць у мышалоўку,
Каб мы ўсе жылі-гібелі
Пад крылом у вашай ласкі,
Як прыблуды на вяселлі,
Як пры вогнішчы падпаскі.

Хай не Польшча, Украіна,
Але й мы не лыкам шыты.
Мы - дзяржава,
Мы - краіна,
Край жывы і знакаміты.

Ёсць у нас лясы і рэкі,
І азёры,
І дубровы.
Ды і мы не недарэкі,
Маем рукі і галовы.

Мы свой лёс вяршылі імі,
Абмывалі ў чыстых росах.
І з хваробамі сваімі
Мы як-небудзь разбяромся.

Уладкуем край свой ёмка,
Скінем навалач цяжкую.
А яшчэ і пасмяёмся.
А яшчэ і пасвяткуем...

***

Было:
Паэзія збірала стадыёны.
Цяпер прыйшлі інакшыя часы -
Тут прадаюць
Скуранкі
І дыёды,
Ралеты,
Кастаньеты,
Паясы.

І там,
Дзе барды надрывалі глоткі,
Дзе звонка струны рваліся ў гітар,
Ляжаць
З Кітаю звезеныя шмоткі
І ў туркаў перакуплены тавар.

Няма больш-
Ні паэзіі,
Ні спорту.
Затое,
Як на танным кірмашы -
Купальнікі,
Духі,
Талеркі,
Шорты,
Будзільнікі,
Свяцільнікі,
Нажы...

Няўжо былое назаўжды прапала?
Але зірні -
На модных рукзаках
Сядзіць дзяўчына з томікам Купалы
І лугавымі кветкамі ў руках.

Каля прымоўклай чашы стадыёна
Яна адна.
І ўсё ж я разглядзеў
У маладых вачах яе замглёных
На заўтра неўсвядомлены спадзеў.

***

Да "мінімізацыі" праграм
па беларускай літаратуры
ў школах

Ну што,
Браткі Рыгор і Ніле,
Мінімізіравалі нас
І перад намі зачынілі
Запоўнены дзятвою клас.

І мы патрапілі ў апалу
Да тых,
Каму даўно карціць
То падрэдагаваць Купалу,
То Быкава падкараціць.

Ім замінае наша слова,
Таму і выгнана яно
І з тэлескрынак мадэрновых,
І з найсучаснага кіно.

За маладзёнаў узяліся,
Каб перш,
Чым выправіць у свет,
Атрэсці,
Як сухое лісце,
З іх душ
Радзімы першацвет.

Нахабныя, тупыя зухі
Такі наладзілі хаўрус,
Што ўжо вось-вось мінімізуюць
Саму краіну Беларусь...

***

Як пройдзеш сталасці рубеж,
Дык папытайся строга,
Ці тою справаю жывеш,
Ці той ідзеш дарогай.

Ці элін ты,
Ці іудзей,
Ці з горада,
Ці з вёскі,
Будзь чалавекам між людзей,
Жыві законам Боскім
І ні ўшчуванняў школьных дам,
Ні самадурства боса,
Ні нават Страшнага Суда
Ніколечкі не бойся.

***

Былому
калегу-літаратару

Ты так хацеў бы,
Ягамосць,
Усім давесці не на жарты,
Што нас няма.
А мы ўсё ж ёсць
І для людзей чагосьці варты.

Пра нас даўно ты ні гу-гу.
Ды памяць цепліцца жывая.
І песні нашыя спяваюць,
І кнігі нашы берагуць.

І вінаватыя не мы,
Што не вядуць цябе ў палацы,
Што ў крамах згорблена пыляцца
Твае шыкоўныя тамы.

Хоць не вылазіш ты з экрана,
Наіўна дзелячы Парнас,
Павер мне,
Позна або рана
Закончыцца твой зорны час.

Тады перад табой,
Знямелым,
Адкрыецца святое штось
І стане ўрэшце зразумелым,
Каго няма,
А хто ўсё ж ёсць.

Чаму?

Хоць і зглуміў нямала сіл,
Не змог даўмецца я,
Чаму не менее зусім
Чыноўнікаў сям'я,
Чаму ў іх вечны страх сядзіць
І злосць душу дзяўбе
І ўсіх ім хочацца судзіць,
Даруючы сабе?

Чаму за гэтулькі гадоў
Уся тупая раць
Паспела вывучыць адно -
Ламаць,
Крышыць,
Караць?

Чаму мы іх перамагчы
Не ўмеем,
Як чуму,
А ўсё трываем і маўчым?..
Чаму?
Чаму?
Чаму...

***

Нішчымныя чаркі і скваркі.
Балотных туманаў агні,
Дурныя дзяржаўныя сваркі
І пеннае мора хлусні...

Пакора ўсіх нас атруціла
І душы скруціла вузлом.
Здаецца,
Не знойдзецца сіла,
Каб зло наша зрынуць на злом.

Так хочацца выйсці адразу
З халодных ахоўных муроў...
Вось толькі ці варта адказу
Прасіць у чужых ваяроў?..

***

Я ўжо адвык падвохаў апасацца
І не чакаю ад нябёс дарогу.
Жыву сабе памалу,
Без сенсацый,
І слухаюся мудрых дактароў.

Цярплю з усімі разам
І бядую,
Для выжывання не шкадую жыл.
Паветраныя замкі не будую,
Ну а зямных,
Відаць,
Не заслужыў.

Куды мне там за маладымі ўгнацца!
Навошта ім мой старамодны спеў,
Калі ні ўзнагарод,
Ні асігнацый
Я назапасіць так і не паспеў?..

І хоць даймае стомленасць цяжкая
І не знайсці для радасці дражджэй,
Я на сваё жыццё не наракаю,
Бо ведаю:
Другім яшчэ цяжэй...

***

Нахабствам зла пераляканы,
Ратуючы ад бедаў свет,
"Дабру быць трэба з кулакамі!" -
Аднойчы выгукнуў паэт.

Ды ў бітвах вечных
Ці лакальных
Даўно заўважыў я адно:
Усе махаюць кулакамі,
Дабра вось толькі не відно...

***

Хаця ў кішэнях драбяза брынчыць,
Чужыя грошы не люблю лічыць.

Мне даспадобы варыянт такі,
Калі ў людзей цяжэюць кашалькі,
Калі за свой праліты шчодра пот
Жыць можна без згрызот і без турбот.

Але і мне,
Бывае,
Крыўдна мець
Не золата,
Не серабро,
А медзь.

***

Мой даўні полацкі зямляк,
Які лічыўся сябрам верным,
Цяпер,
Сустрэўшыся няўзнак,
Убок свой твар старанна верне.

Яму я антураж псую,
Нібы хвастаты чорт з рагамі.
Пасаду хлебную сваю
Ён ад мяне аберагае.

Што ж,
У жыцці ўсё можа быць -
І здрада,
І расчараванне,
Былое хоча ён забыць
У фарысейскім шчыраванні.

А я з адданасцю святой
У маладосць ірвуся ў скрусе -
Свой твар абмыю Палатой
І на Сафійку памалюся...

***

У небе высокім
Бялюткай аўчынкай
Ледзь бачная вокам
Плыве аблачынка.

Плыве над абшарам
Па роўнядзі гладкай
Дзіцячаю марай,
Старэчаю згадкай.

Плыве самапасам
Над лугам і плёсам
Над спыненым часам,
Над споўненым лёсам...

Як памяць сівая,
Што хоча спачынку,
Знікае,
Сплывае
Мая аблачынка...

Беларускі характар

Вы хацелі мяне пакрыўдзіць -
Зганілі мае вершы.
Я толькі горка ўсміхнуўся.

Вы хацелі мяне зняважыць -
Абразілі майго сына.
Я моўчкі каўтнуў слязу.

Вы захацелі мяне прынізіць -
Плюнулі ў душу Беларусі.
Я сціснуў кулакі.

Сцеражыцеся, паганцы!..

Залішне порсткім прэтэндэнтам на славу

На п'едэстал вы пнецеся дарма,
Бо помнікі не робяцца з дзярма.



ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Беларускія вершы гучалі па-літоўску

На мінулым тыдні ў амбасадзе Літвы ў Мінску адбылася прэзентацыя вершаў Алеся Разанава "Паляванне ў райскай даліне", а таксама анталогіі сучаснай беларускай паэзіі "Святло ў вокнах" на літоўскай мове.

140 вершаў 24 беларускіх паэтаў загучалі на літоўскай мове дзякуючы вядомым перакладчыкам Владасу Шымкусу, Владасу Бразюнасу, Йонасу Стралкунасу. Зборнік Алеся Разанава пераклала старшыня Літоўскай асацыяцыі беларусістаў Альма Лапінскене.

У імпрэзе прынялі ўдзел многія вядомыя беларускія паэты: Алесь Пашкевіч, Леанід Дранько-Майсюк, Сяргей Законнікаў і іншыя. Яны чыталі свае вершы па-беларуску, а іх калегі з Вільнюса — па-літоўску. Але, безумоўна, галоўным героем вечарыны стаў Алесь Разанаў. Літоўская перакладчыца ягонай кнігі "Паляванне ў райскай даліне" Альма Лапінскене зазначыла: " Я вельмі рада, што выйшла кніга Алеся Разанава, даўняга сябра нашай краіны". Паэт у сваю чаргу падзякаваў літоўскай амбасадзе за пераклад ягоных вершаў і дадаў: "Гэта вельмі прыемна — удзельнічаць у тым, пра што гаворыць беларуская прыказка і паэт Оскар Мілаш, і я спадзяюся, што мы сапраўды ўдзельнічаем у гэтай справе — "каб Вільня была таксама і тут".

Увогуле, па словах Альмы Лапінскене, апошнім часам з беларускай мовы на літоўскую перакладаецца толькі па... палове кнігі ў год. Хаця традыцыя перакладаў даўняя, упершыню беларускі верш загучаў па-літоўску яшчэ ў 1908 годзе.

— *Савецкі час вызначаўся даволі актыўнымі стасункамі паміж пісьменнікамі і перакладчыкамі Літвы і Беларусі,* — зазначыла Альма Лапінскене. — *У рэспубліках праводзіліся тыдні літаратуры Літвы і Беларусі, перакладалася шмат кніг. Але, безумоўна, у гэты час было шмат шэрасці, павярхоўнасці і яшчэ больш — ідэалогіі. У першую чаргу перакладаліся сталыя, ідэалагічныя творы. Але, дзякуй Богу, не толькі.*

Якая сёння склалася сітуацыя з перакладамі? Адкажу проста: яна жадае лепшага. З 1990 года ў Вільнюсе выдадзена 9 кніг беларускіх аўтараў, уключаючы і тыя дзве, якія мы сёння сустракаем. Колькі выдаецца літоўскіх аўтараў у Мінску, не ведаю, але, думаю, што яшчэ менш. Выяўляецца нейкі абсурд: калі маем магчымасць перакладаць не ідэалагічную, а мастацкую літаратуру, перакладанне стала меншым...

Грошы на выданне вершаў Алеся Разанава "Паляванне ў райскай даліне", а таксама на анталогію сучаснай беларускай паэзіі "Святло ў вокнах" па словах амбасадара Літвы Эдмінаса Багдонаса знайшло Міністэрства замежных спраў Літвы. Анталогія — праект не камерцыйны, падкрэсліў выдаўца Вілюс Гужаўскас: "Кнігі прадаюцца, але не настолькі, каб можна было жыць з гэтага выдаўцу".

Наклад абедзвюх кніг невялікі — па 500 асобнікаў.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Алесь Разанаў і Альма Лапінскене.



Удзельнікаў вечарыны вітае амбасадар Літвы ў Беларусі Эдмінас Багдонас.

ДРОБЯЗЬ?

«Клюква, клюква!» Замест спрадвечных журавін

Журавіны ўрадзілі сёлета як бадай ніколі — і шмат наспела, і ягады пад спелую вішню. Цана з улікам спажыўных якасцяў не танная. За літровы слоік на рынку ў Слуцку просяць 5 тысяч рублёў, за вядзерца — усе 30 тысяч.

Гандляроў гэтым таварам у нядзелю налічыў больш за два дзесяткі. Але цана стрымлівае збяднелых пакупнікоў, і гандляры агалошваюць паветра энергічным поклічам "Покупайте клюкву!". З-за старэчай бяззубасці апошняе слова ў некаторых прадаўцоў гучыць як "клюка". Прыкідваюся гэткім нязнайкам і пытаюся:

— Як жа вашы ягады завуць?

— Клюква! — у адзін голас адказваюць усе, гледзячы на мяне са здзіўленнем.

— А па-нашаму, па-беларуску, як?

Пацепваюць плячыма:

— Да, наверно, тоже "клюква"...

Гандляры і гандляркі — не мясцовыя. На Случчыне ў выніку "меліярацыі" балот не засталося, так што возяць да нас ягады са Старых Дарог. Кошт не таннага праезду кладзецца на цану сабраных ягад. Але ж мне хоць дарам аддавай тую "клюкву", у рот не палезе. Гэта ж прыроджаныя журавіны! Тым болей што прывезлі іх з беларускай глыбінкі.

Толькі адна маладзіца пацешыла "нашанскай" назвай. Можа, згадала, як па вясне журавы, вяртаючыся з выраю, садзяцца для папаскі на балота, дзе чырванеюць перамерзлыя за зіму, але такія смачныя ягады... Ад самой прыроды, жыцця роднай зямлі і ўтварылася паэтычная назва — "журавіны".

Ды не шанцуе ім у сённяшнім свеце. Паўсюль, нават сярод вяскоўцаў, гучыць не нашае — "клюква". А замест "суніцы", "чарніцы", "буякі", чуеш "земляника", "черника", "голубика", быццам растуць ягады не ў беларускім бары...

Здавалася б, дробязь, але рэжа слых. Баліць, што многія і не думаюць вяртаць сабе роднае слова. Ці не трывожны паказчык: у бібліятэцы горада на абанеменце з 51.630 кнігавыданняў за 9 месяцаў на беларускамоўныя кніжкі прыпала ўсяго 1769. Бо тыражы рускамоўных дзяржаўных выданняў у дзесяткі, а то і сотні разоў пераважаюць беларускамоўныя. Логікі тут, як у той "развесистой клюквы"...

Міхась ТЫЧЫНА.

г.Слуцк.

СІТУАЦЫЯ

Хакеісты зарабляюць на таталізатары?

Здаецца, ні для каго не сакрэт, што ў вялікім спорце круцяцца вялікія грошы. Не менш вялікія грошы круцяцца і ў каляспартыўных колах.

Калі браць у разлік стаўкі на вынікі спартыўных спаборніцтваў, то паўсюдна існуюць людзі, якія зарабляюць на гэтым немалыя дывідэнды. А калі яшчэ да пачатку спартыўнай падзеі вы дакладна ведаеце, якая з каманд пераможа, то спакуса зарабіць "лёгкія грошы" бярэ верх нават над здаровым сэнсам.

Літаральна за некалькі дзён да старту Кантынентальнай хакейнай лігі, у якой гуляе і айчыннае мінскае "Дынама", на неабсяжных прасторах інтэрнета з'явіўся сайт — http://russiakhl.funbb.ru. Яго стваральнік назваўся Аляксандрам і паабяцаў наведвальнікам уласнай старонкі, што будзе выкладваць на сайце толькі беспамылковую інфармацыю адносна вынікаў матчаў Кантынентальнай хакейнай лігі. Сваю дасведчанасць у хакейных справах Аляксандр пацвердзіў тым, што асабіста знаёмы з некаторымі хакеістамі, якія гуляюць у Кантынентальнай хакейнай лізе, і ягоныя прагнозы грунтуюцца ў тым ліку і на меркаваннях, якімі з ім быццам бы дзеляцца самі спартсмены.

І далей пайшло-паехала. Ахвотнікі да лёгкай спажывы, зразумела, знайшліся. Варта сказаць, што і Аляксандр людзей не падставіў. Першы стопрацэнтны прагноз у яго выкананні быў наступным: у ноч перад пачаткам стартавага тура Аляксандр паведаміў, што смела можна ставіць грошы на тое, што хакейны клуб МУС не прайграе "Віцязю". У букмекерскіх канторах на такі вынік сустрэчы давалі каэфіцыент 1,68. Гэта значыць, што пры стаўцы 100.000 беларускіх рублёў чысты прыбытак склаў 68 тысяч. Стаўка згуляла, той матч хакейны клуб МУС не прайграў...

Увогуле, прадбачлівасці Аляксандра можна было б пазайздросціць. З 13 прапанаваных сустрэч "правільна" скончыліся 12. У яшчэ адным выпадку людзі, якія паверылі Аляксандру, не прайгралі, а здолелі вярнуць сабе пастаўленыя грошы.

Бадай самым цікавым прагнозам ад Аляксандра быў наступны: за некалькі гадзін да пачатку сустрэчы паміж магнітагорскім "Металургам" і "Ладай" з Тальяці ён паведаміў, што яму дакладна вядома аб тым, што "Лада" прайграе сапернікам у серыі булітаў. Тыя, хто паспеў скарыстацца гэтай падказкай, у літаральным сэнсе азаляціліся. На нічыю ў асноўны час сустрэчы букмекерскі каэфіцыент складаў 5,5. Пры стаўцы ў 100 тысяч беларускіх рублёў чысты прыбытак складаў 450 тысяч. Аднак тыя, хто адважыўся паставіць на нічыю з улікам овертайма, атрымалі грошай у шэсць разоў болей, чым паставілі. А тыя, хто цалкам даверыўся Аляксандру і паставіў на паражэнне магнітагорскага "Металурга" ў серыі булітаў, атрымалі ажно ў сем з паловай разоў болей. Між іншым, за "Металург" у той сустрэчы гуляў беларускі галкіпер Андрэй Мезін. Але інфармаванасць Аляксандра наводзіць на падазрэнні аб тым, што вынік матчаў у Кантынентальнай хакейнай лізе загадзя вядомы і самім хакеістам. Пагадзіцеся, трэба валодаць здольнасцямі Настрадамуса, каб беспамылкова яшчэ да пачатку сустрэч аб'яўляць іх вынік.

Праўда, кіраўнікі і хакеісты сталічнага "Дынама" могуць уздыхнуць з палёгкай. Усёвідушчы Аляксандр ні разу не браўся прагназаваць вынік сустрэчы з удзелам нашай каманды.

Дарэчы, кіраўніцтва Кантынентальнай хакейнай лігі ад нейкіх каментарыяў на гэты конт пакуль устрымліваецца. Тым часам Аляксандр, які, безумоўна, валодае някепскімі аналітычнымі здольнасцямі, паставіў свой бізнес на камерцыйны падмурак. Зарэкамендаваўшы сябе нядрэнным прагназістам, зараз ён збірае за правільны прагноз 1500 расійскіх рублёў (прыкладна 120 тысяч беларускіх рублёў)... Тым, хто заплаціў, на электронную скрыню працягваюць паступаць праваныя вынікі...

Цікава, ці зарабляюць гэтым хакеісты?

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

Вот вам вазон!

Организаторы летней Олимпиады 2012 года, которая пройдет в Лондоне, заявили о том, что спортсменам, участвующим в Играх, в качестве сувенира будут вручаться цветы в горшках.

Решение оргкомитета лондонской Олимпиады о замене традиционных букетов из срезанных цветов на композиции из растений в горшках, которые будут дарить медалистам Игр и представителям олимпийских делегаций, озвучила министр культуры Великобритании Тесса Джоуэлл, курирующая подготовку к соревнованиям 2012 года.

Так, она рассказала, что олимпийские сувенирные композиции для спортсменов будут составлены из цветов, которые выращивает Королевское садоводческое общество Великобритании.

По словам эксперта Королевского садоводческого общества, единственной проблемой для организаторов Игр-2012 пока является то, что они не могут решить, в каком именно виде преподносить олимпийцам растения в горшках. Однако, как пишет издание, все детали относительно цветочных сувениров будут улажены к 2012 году.

ФУТБОЛ

Минское «Динамо» «засеребрилось»

В минувшее воскресенье завершился чемпионат Беларуси по футболу.

Интрига получилась. Потому что если БАТЭ заранее обеспечил себе чемпионство, то вопрос "бронзы" и "серебра" решался именно в последнем туре. И после победы минского "Динамо" над могилевским "Савитом" — 4:1 — стало ясно, что серебряные медали достались минчанам.

А из высшей лиги в этом сезоне "вылетели" сразу три команды. В число неудачников попали минский "Локомотив", могилевский "Савит" и "Дарида" из Минского района.

"Чемпионат откровенно слабый, — говорит чемпион СССР в составе минского "Динамо" Валерий Мельников. — Об этом можно судить по зрительскому интересу к матчам. Естественно, я не принимаю в расчет игры с участием БАТЭ. Честное слово, иногда заснуть можно прямо на трибуне. Настолько скучно, блекло и невыразительно играют наши многие команды. Кому нужен такой футбол, когда на матче сидит 50 болельщиков и 500 милиционеров? Да, со следующего сезона число команд сократится до 14. Но смело можно было бы урезать их количество и до 12. Потому что уровень "подвальных" команд разнится с лидерами, как небо и земля. Получается море проходных матчей, которые никому не интересны. В нормальных странах уже давно что-то делали бы, если на матчи приходит по 50—300 болельщиков. Для кого, спрашивается, играем?! Кроме того, на мой взгляд, у нас очень слабые тренерские кадры. Из команды в команду каждый год ходят одни и те же люди, нет новизны. Хотя посмотрите на главного тренера БАТЭ Виктора Гончаренко. Молодой парень, а фору даст любому аксакалу. И еще. В последнее время у нас пошла мода на "легионеров". Так вот это вообще отдельная тема для разговора. Потому что лично я, например, не вижу смысла приглашать в команды игроков, которые иногда даже ниже уровнем, чем свои. Есть некоторые приятные исключения, но их единицы. В БАТЭ, минском "Динамо"... Никого не хочу обидеть, но это на самом деле так. Так не лучше ли давать расти белорусским игрокам, которым иногда не хватает места в составе из-за таких вот "легионеров". Вы спросите у любого любителя футбола — пускай он с ходу назовет яркого иностранца, который заблистал в белорусском чемпионате. Не думаю, что кто-то что-то скажет. Вот вам и весь уровень чемпионата. Повторюсь, БАТЭ в этом плане исключение, потому что в первую очередь за счет своей кадровой и воспитательной политики добился того, что клуб имеет на сегодняшний момент. И очень странно, когда чиновники из Федерации футбола "примазываются" к успеху клуба. Вы-то здесь при чем? В целом посмотрите на ситуацию! Так что чемпионат завершился — чепчики в воздух подбрасывать не стоит. Когда на матчах будут полные трибуны зрителей, вот тогда я скажу: "Это был хороший чемпионат".

Алесь СИВЫЙ.

БИАТЛОН

Биатлонисты уже разминаются

3 декабря начинается биатлонный сезон. Для белорусов да и для остальных сборных это будет генеральная репетиция перед Олимпиадой в Ванкувере.

По словам гостренера по биатлону Александра Беляева, подготовка наших биатлонистов "проходила по плану и без срывов".

"На этот сезон мы пригласили к себе известного немецкого специалиста, — говорит Александр Михайлович. — *Насколько это скажется на результатах сборной? Увидим. Но уже сегодня могу сказать, что это хороший, профессиональный специалист, который может многое подсказать и многому научить. Всегда идет на пользу, когда приходит человек, владеющий новыми технологиями. У нас с ним контракт пока на год. А вообще, в этом сезоне все будут работать, согласно программе подготовки к Играм. Поправки будут только по месту проведения сборов и срокам. Задачи же будут ставиться сугубо индивидуальные. Но задачи занять определенное место — нет".*

Специалисты говорят, что на сегодняшний момент особых поводов для оптимизма пока нет. Минувшей осенью из стана нашей сборной уехала в Россию (а точнее — вернулась на свою родину) Наталья Соколова. Туда же после конфликта с нашей Федерацией отправилась и еще одна ведущая белорусская биатлонистка — Екатерина Иванова.

"Еще раз убедились, что Белорусская федерация биатлона не ценит людей, от которых зависит ее успех, — с обидой выступила затем в прессе Екатерина. — *Представьте себе профессиональный футбольный клуб с подобным отношением к игрокам: результаты на глазах падают, но его руководство все равно конфликтует со спортсменами и тренерами, не выплачивает им денег и, как следствие, создает условия для их ухода. При этом грамотной системы замены специалистов на легионеров или дублеров нет. В итоге клуб скатывается в турнирной таблице естественным образом. И думать, что он когда-нибудь при таком подходе начнет выигрывать, — верх легкомыслия и непрофессионализма. Невзирая на это, руководство остается гордым и принципиальным, следуя своей тактике в работе с персоналом... Нашей федерации не хватает профессионального менеджера с хорошим бизнес-образованием и практикой, который построил бы работу так, что результат был бы гарантирован и не надо было бы надеяться на авось".*

Позже была целая эпопея с переходом опытного российского биатлониста Сергея Рожкова под знамена белорусской сборной. Ситуация оказалась непростой: россияне не хотели отпускать Рожкова. Белорусам не хватило настойчивости, чтобы заполучить его. В итоге пришли к тому, с чего и начинали: Рожков остался в России. Но, как бы там ни было, а истинные любители биатлона все равно с нетерпением ожидают старта сезона. А дальше уж — как карта ляжет.

По словам руководителя команды Владимира Плаксина, этой зимой наша сборная будет выступать тремя мужчинами. Основные, конечно, Валиуллин, Новиков и Сыман. Кроме того, в "запасе" по этапам Кубка мира будут возить еще двух человек.

У женщин квота на шестерых — вернувшаяся в строй Назарова, Домрачева, Скардино, Ананько, Кудряшова и Калинчик. Главный тренер женской сборной Андриан Цыбульский настроен довольно оптимистично, но в то же время признает: *"Те результаты, которые показывали в прошлом сезоне, никого не устраивают. За три года, что работает наш коллектив, у нас сформировалось понимание, как и кому надо готовиться".*

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Ратуйма «Народную волю» разам!

Мы ўжо звярталі ўвагу на тое, што фінансавае становішча рэдакцыі надзвычай цяжкае. Таму ў чарговы раз нагадваем тым, хто ў першай палове лістапада атрымліваў газету авансам: калі ласка, зрабіце **аплату** ў бліжэйшыя дні.

Спадзяемся, што ўлады вось-вось здымуць блакаду з падпіскі праз "Белпошту", з шапікаў і распаўсюджвання газеты праз "Белсаюздрук". Але каб не загубіць "Народную волю", давайце, не чакаючы цуда дзейнічаць так, як і дзейнічаем ужо на працягу трох з лішнім гадоў. Тэрмінова афармляйце **перадаплату** на студзень—чэрвень 2009 года ўключна альбо на любы абраны тэрмін — на месяц, два, тры, чатыры...

Пералічыць грошы, ведаеце, можна праз любы філіял "Беларусбанка" ці праз паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 328-63-93 ці 328-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць перадаплату за любы тэрмін і па любым адрасе.

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, на фінансавы крызіс, які бярэ за горла і Беларусь, у нас тарыфы **па перадаплаце** ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу сёлета павысіўся, то выгадна рабіць **перадаплату**, з тым каб газета дастаўлялася дахаты.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што **перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ**, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з "Народнай воляй", "Народная воля" — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г., январь, февраль, март, апрель май, июнь 2009 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г., январь, февраль, март, апрель май, июнь 2009 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г., январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2009 г.
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия

имя **отч.**

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)

улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*

дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: если можете — укажите, пожалуйста, код подъезда или номер дом.телефона; в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

ВОКРУГ СПОРТА

Поедут с экскортом

Выезжающих за рубеж белорусских футбольных фанатов будут сопровождать милиционеры. Командировки охранников правопорядка будет оплачивать Ассоциация "Белорусская федерация футбола" (БФФ).

По словам главы БФФ Геннадия Невыгласа, решение принято на основании положительного опыта работы английских полицейских в Минске на матче Беларусь—Англия в октябре 2008 года.

Невыглас отметил, что правоохранительные органы других стран регулярно задерживают болельщиков минского "Динамо", которые в Беларуси ведут себя законопослушно.

Представитель фанатской группировки "Динамо", комментируя решение БФФ, выразил мнение, что белорусских болельщиков на родине считают людьми второго сорта.

Уволили лучшего

Бывший наставник миланского "Интера" Роберто Манчини получил приз, вручающийся лучшему футбольному тренеру года в Италии.

Манчини привел "Интер" к трем подряд победам в чемпионате страны, но по окончании сезона-2007/08 был уволен за неудачное выступление команды в Лиге чемпионов. Манчини заявил, что выиграл почетную награду благодаря своим игрокам. Бывший тренер "Интера" был признан лучшим наставником Италии впервые в своей карьере.

В настоящее время Манчини считается одним из главных претендентов на пост тренера мадридского "Реала". Руководство "Реала", недовольное выступлением команды, рассматривает варианты замены нынешнего наставника Бернда Шустера.

Подготовил Алесь СВЕТЛАНИЧ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 19.11.2008 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №